ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 94 (1628) | Аўторак, 28 лістапада 1961 года | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

НОВАЕ Ў РАБОЦЕ БІБЛІЯТЭК ◆ П'ЕСА П. ВАСІЛЕЎСКАГА «ЛЮБОЎ, НАДЗЕЯ, ВЕРА...» Ў ТЭАТРЫ ІМЯ Я. КУПАЛЫ. ◆ **НАДЗЁННЫЯ ПРАБЛЕМЫ САВЕЦКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ** ◆ НОВЫЯ ВЕРШЫ АНТОНА БЯЛЕВІЧА ◆ **АПАВЯДАННЕ Э. КАРПАЧОВА.**

ДРУГ І ДАРАДЧЫК

Кожная кніга ўяўляецца мне цудам, гаварыў Максім Горкі.

Так, кніга — гэта сапраўды вялікае цуда. З яе старонак ты даведваешся і пра асваенне савецкім чалавекам касмічнай прасторы, і пра таямніцы марскіх глыбінь, і пра поспехі радыёэлектронікі... Яна раскрые перад табою велічны подзвіг савецкага народа ў дні Вялікай Айчыннай вайны, раскажа пра даўняе мінулае. Пра многае вялікае і важнае, прыгожае і высакароднае раскажа нам верны друг і дарадчык — кніга.

І як тут не прыгадаць словы вялікага правадыра працоўных Ул. І. Леніна, які гаварыў, што без кнігі — няма ведаў, без ведаў — няма камунізма. Несці святло ведаў, святло навукі і культуры самаму масаваму чытачу горада і вёскі — пачэсны абавязак работнікаў бібліятэк.

Многа добрых і цёплых слоў сказана пра чулага і сціплага чалавека, які непрыкметна робіць вялікую справу — пра бібліятэкара. Імя яго мы часта праносім праз усё сваё жыццё, бо ён яшчэ ў маленстве адкрыў нам дарогу ў цудоўны і нязведаны свет навукі, культуры, мастацтва, навучыў любіць і шанаваць кнігу.

Можна назваць дзесяткі, сотні імён бібліятэкараў, якія ўсе веды свае, умельства, увесь агонь душы сваёй аддаюць прапагандзе кнігі. Цяпер ужо нікога не здзівіць, што ў чырвоным кутку жывёлагадоўчай фермы калгаса ці саўгаса ёсць бібліятэчка, якой загадвае на грамадскіх асновах даярка ці свінарка, учарашняя дзесяцікласніца, а сёння — завочніца тэхнікума або інстытута, што ў цэхах нашых прадпрыемстваў у абедзенны перапынак паяўляюцца кніганошы, якія добраахвотна, па загаду сэрца, прыносяць сваім таварышам кнігі з бібліятэкі, што ў многіх гарадах паспяхова працуюць так званыя хатнія бібліятэкі, а ў вёсках — пункты выдачы кніг і перасоўкі.

Сярод лепшых у рэспубліцы варта назваць бібліятэку калгаса «Новае жыццё» Карэліцкага раёна, сельскія бібліятэкі: Талькаўскую — Пухавіцкага, Дашкаўскую — Магілёўскага, Хралянскую — Пліскага, Улукаўскую — Гомельскага, Даўяцкую — Браслаўскага, Асінаўскую — Чавускага раёнаў і многія іншыя. Цікава будуюць сваю работу Нясвіжская, Лепельская, Вілейская, Брагінская, Кобрынская, Смалявіцкая, Шаркаўшчынская раённыя бібліятэкі, а таксама Уздзенская дзіцячая, Мінская дзіцячая бібліятэка № 2 Савецкага раёна, Полацкая гарадская бібліятэка.

Нашы лепшыя бібліятэчныя работнікі правільна зразумелі свае задачы: **не чакаць, пакуль да іх прыйдзе чытач, а ісці да яго, шукаць яго.** Так і робіць загадчыца Талькаўскай сельскай бібліятэкі Тацяна Кандрацьева. Разам з актывістамі яна наладзіла работу перасовак, кніганош, падворныя абходы чытачоў. І вось вынікі — сельская бібліятэка мае 1 500 чытачоў, сярод якіх пераважная большасць працаўнікоў сельскай гаспадаркі, інтэлігенцыі, служачых! Дашкаўская сельская бібліятэка абслугоўвае 1 350, а Улукаўская — амаль тысячу чытачоў... Яшчэ некалькі год назад гэтым лічбам ніхто не паверыў бы, а сёння яны яскравыя сведкі тых якасных змен, што адбываюцца ў культурным росце калгаснай вёскі.

XXII з'езд роднай партыі бібліятэкі рэспублікі сустрэлі значнымі поспехамі ў сваёй рабоце. Цяпер ва ўсіх раёнах Беларусі **кнігу чытаюць у кожнай рабочай і калгаснай сям'і, якая жыве ў сельскай мясцовасці.** Дамагчыся гэтага, вядома, нялёгка. На дапамогу бібліятэкарам, прыйшлі мясцовыя партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, шырокая грамадскасць.

Першыя поспехі не даюць падставы для самасупакоенасці. Наадварот, цяпер намаганні трэба падвоіць і патроіць. Задача бібліятэкараў — замацаваць дасягнутыя поспехі і рушыць работу далей — кнігу ў нашай краіне павінен чытаць кожны пісьменны чалавек.

Работнік культуры павінен сёння часцей бываць на калгасных палях і фермах, у цэхах фабрык і заводаў, на будоўлях. Справу трэба арганізаваць так, каб увесь арсенал, уся разнастайнасць форм і сродкаў прапаганды, агітацыі, культурна-асветнай дзейнасці былі накіраваны на дапамогу мясцовым партыйным арганізацыям у вывучэнні новай Праграмы КПСС і матэрыялаў XXII з'езда партыі.

Бібліятэкі рэспублікі сёння працуюць у новай, сапраўды творчай атмасферы. Пошукі новага і неспакой у рабоце — вось тыя рысы, якія павінны вызначаць сёння работу кожнай бібліятэкі і яе актывістаў. Многа ініцыятывы праявілі ў апошні час работнікі Ушацкай раённай бібліятэкі (загадчыца тав. Ляонцьева). І вынікі радуюць нас: кожны другі чытач бярэ грамадска-палітычную літаратуру. Цяпер у цэнтры ўвагі раённай бібліятэкі — прапаганда Праграмы КПСС і дакументаў з'езда.

Работу гэтую трэба разглядаць не як чарговую кампанію. Ёю павінна быць пранізана ўся дзейнасць нашых бібліятэк усіх ведамстваў і арганізацый. Растлумачэнне Праграмы партыі і дакументаў з'езда трэба весці сістэматычна, мэтанакіравана, у цеснай сувязі з канкрэтнымі задачамі таго ці іншага прадпрыемства, калгаса, саўгаса, будоўлі ці ўстановы. Трэба абуджаць у масах новыя творчыя сілы, мабілізоўваць іх на барацьбу за стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, фарміраванне камуністычных адносін паміж людзьмі.

Час патрабуе далейшага павышэння ідэйнага зместу работы бібліятэк. Не толькі культурна-асветніцкая дзейнасць, а мэтанакіраваная, удумлівая прапаганда палітычнай, сельскагаспадарчай, тэхнічнай, навуковай літаратуры, твораў савецкіх пісьменнікаў і сучаснай беларускай літаратуры, у якіх раскрываецца прыгажосць чалавека — будаўніка камуністычнага грамадства, яго новыя адносіны да працы як крыніцы творчасці і асалоды — вось якім павінен быць змест работы бібліятэк.

М. С. Хрушчоў падкрэслівае, што камунізм можна пабудаваць працаю, працаю і толькі працаю мільёнаў. Бібліятэкары не павінны забываць гэтых слоў і ўзяць іх за аснову сваёй работы. Умелая і разумная прапаганда вопыту тых, хто свеціць, вопыту нашых маякоў — адна з асноўных задач кожнай бібліятэкі. Бо станоўчы прыклад, узяты непасрэдна з жыцця, самы лепшы прапагандыст і агітатар.

Трэба ўсяляк пашыраць і заахвочваць грамадскі пачатак у рабоце нашых бібліятэк. Там, дзе ў рабоце бібліятэк прымаюць удзел самі чытачы, там заваяваны адчувальныя поспехі.

Праграма пабудовы камунізма ўступіла ў сілу. Кожны крок бібліятэкара цяпер будзе ацэньвацца ў залежнасці ад таго, наколькі ён адпавядае патрабаванням новага часу. Працаваць па-старому цяпер нельга.

Уважліва прыглядзься, бібліятэкар, да свайго чытача. Ты ўбачыш, што і на калгасным полі, на ферме, на прадпрыемствах, транспарце і на будоўлях цяпер працуюць пераважна маладыя сілы, многія з якіх маюць сярэднюю адукацыю або вучацца ў вячэрніх школах, тэхнікумах і інстытутах. Трэба ведаць патрэбы чытача, цярпліва і настойліва выхоўваць яго густы.

У бібліятэку прыходзяць розныя людзі. Ёсць сярод іх неспрактыкаваныя чытачы, якія просяць даць ім кнігу «пра шпіёнаў», ёсць і такія, якія ведаюць, што ім трэба сёння і якая кніга спатрэбіцца заўтра. Бібліятэкар — гэта чулы выхавацель і настаўнік моладзі. Але, каб заваяваць аўтарытэт у чытача, трэба самому многа ведаць, удумліва чытаць літаратуру. Тады бібліятэкар апраўдае надзеі і спадзяванні маладога чытача, будзе яго сапраўдным дарадчыкам, другам.

Многія бібліятэкі дамагліся значных поспехаў у правядзенні масавых форм прапаганды кнігі. Гэта — канферэнцыі чытачоў, літаратурныя вечары і дыспуты, вечары пытанняў і адказаў і г. д., якія ператварыліся ў своеасаблівыя школы грамадскага выхавання чытача. Але не трэба забываць галоўнага — **індывідуальнай** работы з кожным чытачом, умення параіць яму найбольш патрэбную і карысную кнігу.

Тым не менш, часам органы культуры і метадычныя аддзелы бібліятэк мала звяртаюць увагі менавіта на гэты бок справы. Цярплівую індывідуальную работу з чытачом не вымераеш, не адлюструеш у вялікіх калонках лічбаў справаздач і дакладных, якіх яшчэ, на вялікі жаль, нямала даводзіцца пісаць бібліятэкару. Часта за гэтымі лічбамі хаваецца раўнадушнае стаўленне да чытача.

Бібліятэкі валодаюць зайздросным духоўным скарбам — мільёнамі тамоў кніг. І трэба ацэньваць іх работу не па колькасці кніг, што захоўваюцца на паліцах бібліятэк, а менавіта па тых паказчыках, якія сведчаць, што гэтыя кнігі заўжды ў дарозе, што яны пераходзяць з рук у рукі.

Бібліятэкар — друг і дарадчык нашага чытача — будаўніка камуністычнага грамадства. Якую ж пачэсную справу робіць ён, несучы ў масы святло сацыялістычнай культуры!

«У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЕРАМОГУ КАМУНІЗМА ІДЭАЛАГІЧНАЯ РАБОТА СТАНОВІЦЦА ЎСЁ БОЛЬШ МАГУТНЫМ ФАКТАРАМ, ЧЫМ ВЫШЭЙШАЯ СВЯДОМАСЦЬ ЧЛЕНАЎ ГРАМАДСТВА, ТЫМ ПАЎНЕЙ І ШЫРЭЙ РАЗГОРТВАЕЦЦА ІХ ТВОРЧАЯ АКТЫЎНАСЦЬ У СТВАРЭННІ МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ КАМУНІЗМА, У РАЗВІЦЦІ КАМУНІСТЫЧНЫХ ФОРМ ПРАЦЫ І НОВЫХ АДНОСІН ПАМІЖ ЛЮДЗЬМІ І, ЗНАЧЫЦЬ, ТЫМ ХУТЧЭЙ І БОЛЬШ ПАСПЯХОВА ВЫРАШАЮЦЦА ЗАДАЧЫ БУДАЎНІЦТВА КАМУНІЗМА».

(З Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.).

НОВАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Днямі адбылося пасяджэнне прэзідыума Саюза пісьменнікаў БССР. На ім разглядалася творчасць маладых празаікаў А. Савіцкага, Я. Ермаловіча, Г. Шыловіча і паэтаў — аўтараў першых паэтычных зборнікаў І. Сіпакова і Ю. Свіркі. У абмеркаванні кніг маладых аўтараў прынялі ўдзел пісьменнікі І. Шамякін, Я. Брыль, Р. Няхай, Ул Нядзведскі, І. Грамовіч і інш.

На пасяджэнні Алесь Савіцкі, Якуб Ермаловіч, Георгій Шыловіч, Іван Сіпакоў і Юрась Свірка прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі.

ТЭАТР ДАПАМАГАЕ САМАДЗЕЙНЫМ АРТЫСТАМ

Драматычны калектыў Маладзечанскай мэблевай фабрыкі рыхтуе прэм'еру па п'есе свайго земляка настаўніка Івана Козела «Над хвалямі Серабранкі». Творчую дапамогу самадзейным артыстам аказваюць майстры сцэны Беларускага дзяржаўнага тэатра юнага гледача.

Артысты-аматары пабывалі ў Тэатры юнага гледача на рэпетыцыях, а таксама на прэм'еры. Для канкрэтнай дапамогі да іх выязджалі мастакі А. Агафоненка, В. Станкевіч і заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР Ул. Стэльмах.

Тэатр юнага гледача дапамагае і іншым самадзейным калектывам.

Рэжысёр тэатра, заслужаны артыст БССР В. Пацехін — часты госць драмгурткоўцаў Стаўбцоўскага раённага Дома культуры.

Для сельскага гледача

Адзінаццаць выступленняў — такі вынік падарожжа канцэртнай брыгады Белдзяржфілармоніі па Жлобінскім раёне. Мінскія артысты выступілі ў Жлобіне, Радушскім сельскім клубе, саўгасе «Мормаль», калгасе імя Кірава, клубе «40 год БССР». У праграме канцэртаў — гумар і сатыра, танцы і прыпеўкі, песні савецкіх кампазітараў, музычныя нумары, кітайскія гульні.

ПАСЛЯ З'ЕЗДА

ШЛЯХІ ДА СЭРЦАЎ

Адзінадушна прынятая на XXII з'ездзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза велічная Праграма пабудовы камунізма — самага гуманнага і справядлівага грамадства на зямлі — сустрэла ўсеагульнае ўхваленне савецкіх людзей, выклікала ў іх прыліў творчых сіл.

Па ўсёй рэспубліцы — на прадпрыемствах, у калгасах, установах культуры і творчых арганізацыях — праходзяць цяпер адкрытыя партыйныя сходы з адным пытаннем на парадку дня: вынікі XXII з'езда КПСС і нашы задачы. Такі адкрыты партсход адбыўся днямі ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Дэлегат XXII з'езда КПСС міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў выступіў перад артыстамі і музыкантамі з дакладам аб рабоце з'езда. Ён спыніўся і на тых задачах, якія патрэбна вырашыць творчаму калектыву філармоніі ў бліжэйшы час.

Удзельнікі сходу, горача адабраючы мудрыя рашэнні з'езда, канкрэтна гаварылі аб тым, як работнікі культурнага, ідэалагічнага фронту могуць і павінны дапамагчы паскорыць набліжэнне нашага светлага будучага. Беларуская філармонія дала сёлета 76 шэфскіх канцэртаў, сімфанічны аркестр выступаў летам перад працоўнымі многіх гарадоў рэспублікі, шырока прапагандуючы лепшыя ўзоры класічнай і сучаснай музыкі, а народны аркестр, выязджаючы на гастролі ў сельскую мясцовасць, абслугоўваў калгаснікаў непасрэдна ў полі. Аднак такіх новых, цікавых форм у рабоце канцэртнай арганізацыі хацелася б бачыць значна больш. Ёй патрэбна чула прыслухоўвацца да культурных запатрабаванняў савецкіх людзей, актыўна ўдзельнічаць у выхаванні ў іх высокіх музычных густаў.

Кожны музыкант, вакаліст, артыст размоўнага жанра, калі ён не будзе перыядычна абнаўляць свой рэпертуар і старанна ўдасканальваць выканаўчае майстэрства, наўрад ці будзе карыстацца папулярнасцю ў народа. Народ проста перастане хадзіць на канцэрты такога выканаўцы. Вось чаму для ўсіх творчых калектываў і салістаў філармоніі пытанне падрыхтоўкі новага сучаснага рэпертуару і павышэння якасці яго выканання — застаецца на сённяшні дзень самым важным і першачарговым. Гэтаму якраз былі прысвечаны выступленні мастацкага кіраўніка Белдзяржфілармоніі І. Паліводы, намесніка дырэктара і сакратара партарганізацыі А. Паніхіна, рэдактара сімфанічных і камерных праграм А. Дудзіна і іншых.

— Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР лічыцца адным з лепшых у краіне, — сказаў І. Палівода. — Павялічыўся яго склад, упарадкаваны нормы канцэртных выступленняў. Аднак сапраўдная работа ў калектыве аркестрантаў не наладжана. У ім многа арганізацыйнай неразбярыхі і творчых непаладкаў.

Адкуль жа ўсё гэта ідзе, чаму сімфанічны аркестр за апошні час знізіў тэмпы творчага росту і працуе неяк няроўна? На жаль, І. Палівода прамаўчаў аб гэтых прычынах. Затое А. Паніхін і А. Дудзін дапоўнілі яго і назвалі, як кажуць, рэчы сваімі імёнамі. Яны шчыра гаварылі, што ў многіх непаладках і адсутнасці сапраўднай творчай дысцыпліны ў аркестры вінаваты перш за ўсё галоўны дырыжор В. Дуброўскі. Часта адлучаючыся з Мінска ў доўгія гастрольныя паездкі, ён значна менш удзяляе цяпер увагі свайму калектыву, не змагаецца з ранейшай настойлівасцю за якасць падрыхтоўкі рэпертуару на аркестравых рэпетыцыях.

Законны неспакой многіх прамоўцаў за лёс вядучага музычнага калектыву рэспублікі прымушае верыць, што яго кіраўнікі прыкладуць усе намаганні да таго, каб сімфанічны аркестр яшчэ больш павысіў узровень свайго майстэрства, культуру выканання, каб у яго праграмах, поруч з класічнай музыкай, трывалае месца занялі творы беларускіх кампазітараў.

— Калі Дзяржаўны народны аркестр гэтым летам выступаў перад сельскімі гледачамі Мінскай вобласці, — сказаў дырыжор В. Барсаў, — мы сваімі вачыма бачылі, з якой любоўю працоўныя вёскі імкнуцца да сапраўднай музычнай культуры. Стомленыя пасля работы на полі, калгаснікі заўсёды з радасцю спяшаліся на нашы канцэрты і цёпла прымалі іх.

В. Барсаў гаворыць пра тое, як калектыў, якім ён дырыжыруе, натхнёны рашэннямі з'езда, актыўна ўключыўся ў работу па музычнаму выхаванню падрастаючага пакалення. Для дзяцей і юнацтва ў гэтым сезоне мяркуецца наладзіць тэатралізаваны паказ народных казак, які будзе суправаджацца музыкай народнага аркестра.

Эстрадны жанр — адзін з папулярных у мастацтве. Вясёлыя, жыццярадасныя песні і танцы, музычныя пародыі і сатырычныя фельетоны заўсёды карыстаюцца вялікай любоўю і прызнаннем нашых гледачоў. На якім жа ўзроўні знаходзіцца эстраднае мастацтва Беларусі? Перадз'ездаўскія канцэрты паказалі, што зараз гэты жанр развіваецца ў рэспубліцы значна лепш, ёсць некаторыя творчыя знаходкі і дасягненні. Аднак, як заўважыў І. Палівода, некаторыя работнікі Упраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР адносяцца да эстрады неяк баязліва, з прадузятай думкай: «Глядзі, каб чаго не выйшла!» Нам трэба смялей рухаць наперад сваё нацыянальнае эстраднае мастацтва, гаворыць І. Палівода, больш клапаціцца аб стварэнні арыгінальнага беларускага рэпертуару. На жаль, як паэты, так і кампазітары рэспублікі яшчэ недаацэньваюць значэння гэтага мастацкага жанра, мала пішуць цікавых твораў для эстрады. Мы маглі б самі заказваць эстрадны рэпертуар на актуальныя тэмы і набываць яго ў аўтараў. Адзін час Міністэрства культуры пайшло нам насустрач і згадзілася на гэта, а ў сёлетнім годзе зноў забаронена самастойна купляць музычныя і літаратурныя творы без «санкцыі» рэпертуарнай камісіі міністэрства, якая, дарэчы, збіраецца на свае пасяджэнні раз у два месяцы. Хіба можа эстрадны артыст у такіх умовах дабіцца актуальнасці і надзённасці свайго рэпертуару?

Каштоўныя думкі і заўвагі аб развіцці нацыянальнага эстраднага жанра выказаў і рэжысёр І. Лакштанаў. Паводле яго слоў, творчасць эстраднага артыста тым і карысная, што яна хутка адгукаецца на розныя падзеі сённяшняга дня не толькі гнеўнай, выкрывальнай сатырай, але і гераічнай патэтыкай, сцвярджаючы ўсё новае, перадавое. І. Лакштанаў падкрэслівае, што сапраўдная мастацкая эстрада жыватворна ўплывае на выхаванне ў нашай моладзі высокай маралі і добрых нораваў.

Вялікую выхаваўчую ролю адыгрывае таксама музычна-лекцыйная прапаганда, як сродак далучэння тысяч савецкіх людзей да музычнай культуры. Беларуская філармонія цяпер праводзіць 600 лекцый-канцэртаў у год. Аднак з выступлення лектара-музыказнаўцы Л. Ауэрбаха відаць, што ў пагоні за колькасцю лекцый страчана іх якасць. Заняткі музычных лекторыяў і універсітэтаў культуры, адкрытых нашай філармоніяй у Мінску і гарадах рэспублікі, часта праводзяцца фармальна і нецікава, пры малым зборы слухачоў (у прыватнасці у г. Маладзечна). Лекцыі-канцэрты ілюструюцца музыкай, якая ўжо даўно існуе ў рэпертуары сімфанічнага аркестра, а спецыяльных твораў для гэтага амаль не рыхтуецца.

На сходзе выступілі таксама старшыня мясцкома саліст Д. Зубрыч, артыст народнага аркестра Д. Рудзько, артыст эстрады М. Бязручанка, загадчык гаспадарчай часткі Я. Зелянкоў. Яны таксама ўнеслі канкрэтныя прапановы, накіраваныя на далейшае паляпшэнне творчай і арганізацыйнай работы свайго калектыву.

Покуші новых, найбольш дзейсных форм сувязі з народнымі масамі, новых шляхоў да сэрцаў слухачоў павінны быць больш упартымі і мэтанакіраванымі, — такая агульная думка сходу.

Мінск расце і прыгажэе. Новыя дамы на вуліцы Р. Люксембург. Фота Ул. КРУКА.

НОВАЕ Ў РАБОЦЕ БІБЛІЯТЭК

ВЕЧАРЫ, ПОЎНЫЯ РАМАНТЫКІ

Асінаўская сельская бібліятэка правяла ў трэцім аддзяленні саўгаса «Чавускі» вечар пытанняў і адказаў па матэрыялах XXII з'езда КПСС. Прапагандысты кніг добра падрыхтаваліся да гэтага цікавага мерапрыемства.

Больш 30 пытанняў было атрымана пісьмова яшчэ задоўга да вечара. Якім стане родны саўгас праз 20 год? Ці будзе пры камунізме асабістая маёмасць грамадзян? Як будуць вырашацца пытанні сям'і і шлюбу? Ці праўда, што ў камуністычным грамадстве зусім знікне фізічная праца і ўсё будуць рабіць машыны?..

Настаўнікі мясцовай школы тт. Снігіроў і Дзянісаў, галоўны ўрач Асінаўскай сельскай бальніцы тав. Гарэлікаў, галоўны ветэрынарны ўрач саўгаса тав. Шаўцоў і спецыялісты сельскай гаспадаркі вычарпальна адказалі на ўсе гэтыя пытанні.

Актывісты Асінаўскай сельскай бібліятэкі сталі надзейнымі памочнікамі партыйнай арганізацыі саўгаса ў прапагандзе рашэнняў XXII з'езда і новай Праграмы КПСС. Гэтая прапаганда вядзецца не абстрактна, а ў цеснай сувязі з жыццём, з канкрэтнымі задачамі калектыву саўгаса.

Для таго, каб кожны жыхар сямі населеных пунктаў чытаў кнігі, бібліятэкарка Аляксандра Новікава змяніла свой распарадак дня. Асноўная работа перанесена ў брыгады, у чырвоныя куткі жывёлаводаў. На абанеменце чытачы бяруць кнігі два разы на тыдні. Астатнія дні яны могуць атрымаць літаратуру непасрэдна ў паляводчых брыгадах, у чырвоных кутках. У Альхоўцы, Слабадзе, Грабалаве, Нежкаўцы і Рабятках дзейнічаюць бібліятэкі-перасоўкі, а яшчэ ў дзвюх вёсках — пункты выдачы кніг.

Пры дапамозе такога метаду прапаганды літаратуры бібліятэка дабілася таго, што яе кнігамі карыстаецца 800 чытачоў — кожны пісьменны чалавек у саўгасе.

Пераважная большасць рабочых саўгаса чытае не толькі мастацкія творы, а і літаратуру, якая дапамагае ім дабівацца павышэння прадукцыйнасці і культуры працы.

Свінарка Марыя Чарвінская, цялятніца Валянціна Іванова, жывёлавод Мікалай Аляксеенка, трактарыст Яўген Другачэнка і многія іншыя дзякуюць сваёй сельскай бібліятэцы за набытыя веды. Яны цяпер ідуць у авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне рашэнняў XXII з'езда.

Бібліятэка аператыўна адгукаецца на важнейшыя падзеі ў жыцці партыі і краіны. Адразу, як толькі пачаў работу XXII з'езд партыі, тут было арганізавана абмеркаванне матэрыялаў з'езда ва ўсіх населеных пунктах і брыгадах саўгаса.

Акрамя вечара пытанняў і адказаў цікава прайшоў тэматычны вечар па матэрыялах з'езда. А цяпер савет бібліятэкі сумесна з чытачамі рыхтуе літаратурны вечар на тэму «Цяперашняму пакаленню савецкіх людзей жыць пры камунізме!»

Да гэтага вечара ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці рыхтуюць вялікі канцэрт.

М. АНЮКОЎ.

Чавускі раён.

СЕЙБІТ РАЗУМНАГА, ДОБРАГА

Кацярына Антонаўна выйшла з дому, калі ўжо добра змерклася. У руках яна трымала пачак кніг.

— Куды ты супраць ночы? — спытаў муж. — Людзі нарабіліся за дзень. Ім не да кніг.

— Вось пабачыш — ні адной не прынясу назад, — весела адказала Кацярына Антонаўна.

Ляснула брамка. Цемру прарэзаў пучок святла. Кацярына Антонаўна з цеплынёй успомніла пра мужаў падарунак — маленькі кішэнны ліхтарык. Ён так дарэчы цяпер, калі асенняя ноч — хоць вока выкалі.

Самая крайняя, каля лесу, хата — Марыі Лявончык. У вокнах святло. Ціхі стук у дзверы. І вось Кацярыну Антонаўну акружаюць белавалосыя галоўкі дзяцей. Шчабечуць, як птушаняты, цягнуцца да кніг.

— Можа, пачытаеце што, Марыя Андрэеўна? — пытае бібліятэкарка і раскладвае кнігі.

— Ой, не кажы, родная! Пакуль усіх абмыеш ды абшыеш — галава закружыцца. Шасцёра іх у мяне. Але можа што і вазьму. У вас ёсць кніга па крою і шыццю?

— Калі ласка.

Праз дзён два бібліятэкарка зноў наведала домік ля лесу. Прынесла «Алесю» А. Купрына. Сустрэла неяк жанчыну на вуліцы. А Марыя Андрэеўна не нарадуецца за кнігу, быццам самага лепшага сябра знайшла.

— Сама прачытала і мужа прымусіла. А то ён у мяне ўсё па механізацыі браў. Вядома — трактарыст.

Калгасніца стала актыўным наведвальнікам сельскай бібліятэкі.

У той жа вечар Кацярына Антонаўна Прыдыбайла пабывала ў дамах калгасніц Фені Лявончык, Ганны Нячай. І ў кожнай сям'і пакінула добрага «сябра» — кнігу.

Сёння ў бібліятэчных картачках гэтых калгасніц — дзесяткі прачытаных кніг. Ды ці толькі ў іх адных!

Кацярына Антонаўна ўспамінае першыя крокі сваёй работы ў Прашчыцкай бібліятэцы. Прыйшла яна сюды ў 1956 годзе. На абанеменце — восемдзесят чытачоў ды і тыя ў большасці вучні. А ў зоне яе абслугоўвання 950 двароў! Гэта не менш двух тысяч чытачоў. Да кожнага з іх трэба пракласці сцежку. Адна не справілася б. Дапамаглі камсамольцы Сяргей Цішчанка, Марыя Есіпчык, работніца паштовага аддзялення Марыя Шуманская. А хіба мала дапамог калгаснік Платон Салавей? На дзіва цікаўны чалавек. Адукацыя — чатыры класы царкоўна-прыходскай школы. А пагавары з ім — акадэмік! Летась прачытаў 119 кніг! І што за кнігі: «Асновы марксісцкай філасофіі», «Бог і свабода», «Шлях Абая»... У вёсцы гавораць: «Бібліятэку адчыняе дзядзька Платон». Так яно і ёсць. Платон Салавей — член бібліятэчнага савета. Усе навінкі праходзяць праз яго рукі. Ён першы ў вёсцы «крытык» на новыя кнігі. Калі дзядзьку Платону спадабалася аповесць ці раман — значыць сапраўды кніга вартая.

Заваёўваць сэрцы чытачоў можна ўсюды. Пастух гоніць чараду: «Кацярына Антонаўна, можа ў вас ёсць што пачытаць?» Ну, хіба адмовіш. У яе багатая асабістая бібліятэчка. Вынясе, дасць. Скажа толькі: «Прыходзьце заўтра ў бібліятэку, я для вас адклала вельмі цікавую кнігу». І чалавек прыйдзе.

Зайшла аднойчы Кацярына Антонаўна ў млын. Завозна. Людзі сядзяць, расказваюць анекдоты, а то і проста дрэмлюць. «Вось каб ты нам, маладзіца, пачытаць што прынесла. А то сядзім тут, як ачумелыя, смалім гэты самасад», — сказаў млынар Аляксандр Сталбуноў. Прынесла часопісы, газеты, млынару дала некалькі кніг.

Не забыла і пра бібліятэчкі-перасоўкі. Яны створаны ў пяці населеных пунктах. Камсамольца Міхаіла Цішчанку з вёскі Падзера завуць «правай рукой» Кацярыны Антоноўны. У яго бібліятэцы-перасоўцы 420 кніг. Сто чытачоў з'яўляюцца гаспадарамі гэтага багацця. А ў вёсцы ўсяго 70 двароў...

Пяць гадоў прайшлі непрыкметна. Няма цяпер у калгасе сям'і, дзе б не ведалі вясёлую маладую жанчыну з кнігамі ў руках. А між тым у яе малыя дзеці, свае жаночыя клопаты. Ёсць і грамадскія даручэнні. Кацярына Антонаўна член сельвыканкома, рэдактар калгаснай насценгазеты. Трэба ўсім сэрцам любіць кнігу, сваю справу, каб дзень у дзень стукаць у кожныя дзверы, ісці насустрач чытачу.

Я праглядваю картачкі чытачоў. Іх звыш паўтары тысячы. А было, як памятаеце, толькі восемдзесят. Калі раскінуць па гадах, то выходзіць, што кожны дзень бібліятэкарка «заваёўвала» па чытачу.

Ёсць у калгасе і непісьменныя людзі. Вельмі мала іх, але ёсць. Яны нарадзіліся ў мінулым стагоддзі і ўсё жыццё нядобрым словам успамінаюць той лад, які пазбавіў іх магчымасці навучыцца пісаць і чытаць. На дапамогу гэтым людзям прыйшлі актывісты бібліятэкі. Яны праводзяць з непісьменнымі гучныя чыткі мастацкай літаратуры.

Напярэдадні XXII з'езда КПСС Кацярына Антонаўна ўзяла абавязацельства: забяспечыць кнігай не менш 80 працэнтаў дарослага насельніцтва. У запісной кніжцы бібліятэкаркі скупыя лічбы: верасень — 27 чытачоў, кастрычнік — 31.

Сваё слова Кацярына Антонаўна стрымала.

Праводзяцца ў бібліятэцы і масавыя мерапрыемствы. Цікава прайшоў вечар на тэму «Мы будзем жыць пры камунізме», прысвечаны новай Праграме партыі. Моладзі спадабалася канферэнцыя чытачоў па кнізе «Семнаццацігадовыя». Звыш двухсот чытачоў прыйшло на вечар пытанняў і адказаў на тэму: «За здаровы быт». Па ініцыятыве Кацярыны Антонаўны Прыдыбайла адбыўся дыспут «Дэпутат — слуга народа».

...Цёмна вечарам на вясковай вуліцы. Але вось цемру прарэзаў прамень святла. Жанчына з ліхтарыкам у руцэ ідзе па вуліцы. У руках яе пачак кніг. Іх святло ярчэйшае за кішэнны ліхтарык, бо яно асвятляе людскія душы і сэрцы.

П. МІХАЙЛОЎСКІ.

Слуцкі раён.

ПРЫСВЕЧАНА ПРАГРАМЕ КПСС

«Вялікая праграма будаўніцтва камунізма» — так называецца выстаўка, наладжаная ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Ул. І. Леніна.

У 15 раздзелах экспазіцыі — «XXII з'езд партыі — з'езд будаўнікоў камунізма», «Гістарычная непазбежнасць пераходу ад капіталізму да сацыялізма», «Задачы партыі ў галіне эканамічнага будаўніцтва, стварэння і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма», «Дзяржаўнае будаўніцтва і далейшае развіццё сацыялістычнай дэмакратыі» і іншых, — адлюстраваны грандыёзныя ператварэнні, якія адбыліся ў нашай краіне за гады Савецкай улады.

На стэндах прадстаўлена шматлікая літаратура: творы Ул. І. Леніна, даклады і прамовы М. С. Хрушчова, Праграма і Статут КПСС, дакументы нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый у Маскве, Пастановы Пленумаў ЦК КПСС, матэрыялы XXV з'езда Кампартыі Беларусі, прамовы членаў і кандыдатаў у члены Прэзідыума ЦК КПСС, пісьменнікаў М. Шолахава, А. Твардоўскага, В. Кочатава, М. Грыбачова, А. Карнейчука, мастака В. Іагансона, кнігі, брашуры, артыкулы перыядычнага друку.

ЦІ АДБЫЛАСЯ «ДУШЭЎНАЯ І СУР'ЁЗНАЯ РАЗМОВА»?

У п'есе Пятра Васілеўскага «Любоў, Надзея, Вера...» ёсць момант, калі Люба Корань, якая кахае Сяргея Зорына, пытаецца ў любімага чалавека: «Чаму ўсё так складана? Чаму?»

Зорын адказвае таксама пытаннем: «А каб усё было проста — гэта лепш?»

Думаецца, прыведзеныя рэплікі прынцыпова важныя для разумення задумы драматурга і таго, чаму купалаўскі тэатр узяўся за пастаноўку п'есы, драматургічныя недахопы якой відавочныя пры першым жа прачытанні. Адразу ж скажам: недахопы гэтыя істотныя. Але рэжысёру К. Саннікаву і акцёрам, відаць, імпанавала рашучасць, з якой П. Васілеўскі імкнецца гаварыць пра жыццё не спрошчана, не згладжваючы вострых вуглоў. Імпанавала тэатру, пэўна, і тое, што драматург імкнуўся ісці па гарачых слядах сучасных падзей.

П. Васілеўскі пачынае п'есу голасам Часу: «Вы чуеце? Гэта ў прадонні сусвету б'ецца стальное сэрца нябеснага цела, зробленага, закінутага ў касмічныя вышыні тваім геніем, слаўны савецкі чалавек. Слухай жа голас Спадарожніка! Сёння гэта мой голас, голас Часу. Чалавек! Я выклікаю цябе на душэўную і сур'ёзную размову...»

Пра што гэтая размова? Наколькі, урэшце, яна сур'ёзная?

Начальнік будаўніцтва хімічнага камбіната Сяргей Зорын, як ён сам сябе характарызуе, — «...звычайны мужчына... Зямны, жывучы, хоць у партызанах жыццём і не даражыў», ніколі не адрываецца «ад нашай матухны-зямелькі», «вельмі ж цяжкі груз мінулага» нясе праз жыццё. Яшчэ да прыезду на будоўлю ён пакахаў Любу Корань, якая, паводле яго слоў, «увесь час дзесьці там, у паднябессі». Люба не можа жыць без Зорына («Я ведаю толькі адно: люблю, люблю, люблю!»). У Зорына ёсць жонка Надзея, з якой лёс звязаў яго яшчэ ў партызанах.

К моманту прыезду Любы ў Зорына на будоўлі набралася шмат непрыемнасцей. Механізмы прастойваюць. Заробкі ў рабочых вельмі малыя. Паводле меркаванняў аднаго з іх, рабочыя мелі б столькі ж грошай, колькі зарплаты ў Зорына, «каб быў толк, а раз яго няма — адлічылі мне адзінаццаць рублікаў, як бобу, нават за бяздзетнасць не ўзялі». Да таго ж і культурна-бытавыя запатрабаванні рабочых не забяспечаны. Адсюль — цякучасць кадраў.

У першай палавіне твора акрэсліваюцца ўзаемаадносіны паміж Зорыным і «звышпільным» Дэрашам, якому ўсюды мрояцца ворагі, паміж Зорыным і прыстасаванцам, паклёпнікам і хапугам Журам, паміж Зорыным і Кісялёвым, які хацеў быў уцячы з будоўлі, паміж Зорыным і Коранем — «наскрозь» дабрачынным, ва ўсіх адносінах аж занадта «правільным» чалавекам.

Драматург канцэнтруе ўвагу на Зорыне. І супраць гэтага пярэчыць няма падстаў: аўтар — «гаспадар» свайго твора. Пярэчыць, на нашу думку, варта супраць таго, што ўзаемадачыненні Зорына і памянёных персанажаў у творы не «іграюць» на характарыстыку галоўнага героя. Яны — нібы нейкі фон, на якім разгортваецца драма Зорына, вырашаецца «вечная» тэма кахання. А тут якраз пачынаецца меладрама. Але ж П. Васілеўскі пісаў не меладраму!.. Ён, пэўна, меркаваў надаць твору характар, калі так можна сказаць, «драмы публіцыстычнай». Іншая рэч, наколькі яму гэта ўдалося.

Развіўшы лініі ўзаемаадносін Зорына з Дэрашам, Коранем, Кісялёвым, Журам, драматург мог бы павесці ў п'есе сур'ёзную і шчырую гутарку. Можна нават дапусціць, што пры такім варыянце магло б і не быць лініі Зорын — Люба — Надзея. Аднак паколькі гэтая лінія існуе (і існуе як галоўная ў творы), настолькі з ёй і павінны быць трывала звязаны ўсе астатнія. На жаль, дамагчыся гэтага аўтар п'есы не здолеў.

Кожная з астатніх ліній п'есы (Кісялёў і Нюра, Жора Цуканаў і Вера) магла б даць пачатак самастойнаму твору. Кожная развіваецца амаль сама па сабе, «паралельна». Драматург, відаць, спадзяваўся, што паасобныя лініі будзе спалучаць у адно цэлае падтэкст, што паміж імі будзе сувязь унутраная, асацыятыўная. Магчыма, так і атрымалася б, калі б у творы была выразная вядучая тэма.

Персанажы п'есы не распрацаваны як характары. Яны з'яўляюцца «рупарамі ідэй» аўтара. На нашу думку, увядзенне ў п'есу голасу Часу, у дадзеным выпадку, яшчэ аднаго «рупара» аўтарскіх ідэй, — павялічвае драматургічную слабасць твора

Персанажы п'есы прыслухоўваюцца да голасу Часу, нават уступаюць у непасрэдныя дыялогі з ім. Прыём гэты мог бы узмацніць гучанне п'есы, калі б голас Часу не ператварыўся ў «рэзанёра», калі б яго рэплікі не былі такімі ўжо банальнымі.

Вось што сцвярджае Час:

«Шчасце. Звычайнае чалавечае шчасце... Колькі сіл, натхнення, адвагі і баязлівасці, волі і бязволля штодзённа праяўляе чалавек у пошуках шчасця! Чалавек упарта верыць у шчасце, нават калі яго абяцаюць на тым свеце. І кожнаму хочацца ведаць, што рабіць, як жыць, каб шчасце не абмінула яго...»

«Чалавечае шчасце бязмежна. Яно — як прастора і час. Час няспынна адлічвае хвіліны жыцця. На змену вам з'явяцца новыя людзі...»

А вось Час звяртаецца непасрэдна да Любы: «Ты нічога не значыш, калі ты адна... Змагаючыся за сваё шчасце, думай аб шчасці другіх».

Калі «мараль» у тым, што Люба павінна была, думаючы пра сваё шчасце, клапаціцца пра шчасце Зорына, імкнуцца не прынесці яму няшчасця, як здарылася на справе, дык відаць, што «мараль» не новая і не такая ўжо складаная, ды і пададзена яна, што называецца, у лоб. І няма ў творы, так сказаць, унутранай неабходнасці, каб гэтую «мараль» вымаўляў менавіта Час.

Бывае, што можна ў пэўнай меры дараваць драматургічныя слабасці твора, калі ён нясе ў сабе глыбокія думкі, арыгінальную аўтарскую канцэпцыю рэчаіснасці, калі п'еса бывае не столькі творам для сцэны, колькі п'есай для чытання. На жаль, выразнай аўтарскай канцэпцыі рэчаіснасці, яснай задумы, выразнай ідэі ў творы няма. Таму тыя прыёмы, якія стасуюцца да «драмы публіцыстычнай», у дадзеным выпадку «павісаюць у паветры», увядзенне іх у п'есу не апраўдана. Прыслухаемся да персанажаў п'есы, хаця б да некаторых, найбольш «яркіх» іх выказванняў. Як героі шукаюць адказу на пытанне, пастаўленае Часам: што рабіць? як жыць?

Люба: «...Я ведаю толькі адно: люблю, люблю, люблю! І калі гэта эгаізм, чым жа я вінавата?..»

Корань: «Шчасце... А ведаеш, што ў наш век трэба для сапраўднага чалавечага шчасця? Любіць, спадзявацца і верыць. Любіць Радзіму, нашых людзей, іх добрыя справы. Спадзявацца на лепшае заўтра і, нарэшце, верыць у жыццё!»

Зорын: «...я люблю, і ніхто — чуеце? — ніхто не адбярэ ў мяне права любіць».

Гэтыя і яшчэ некаторыя выказванні — «квінтэсенцыя» філасофіі твора. Усё, што гавораць паміж сабой героі, настолькі відавочнае, што наўрад ці патрабуе доказаў. Таму, відаць, і атрымалася, што адсутнасць самастойнай, аўтарскай яснай задумы прывяла да немагчымасці дасканала пабудаваць твор у драматургічных адносінах.

Жадаючы высветліць, што такое сапраўднае шчасце, сапраўдная прыгажосць душы, сапраўднае каханне, жадаючы высветліць месца чалавека ў жыцці, аўтар імкнуўся паказваць падзеі і людзей ва ўсёй іх жыццёвай складанасці. Але гэтая складанасць не знайшла ў творы натуральнага, праўдзівага ўвасаблення.

Лініі «вытворчая» і «асабістая» звязаны ў творы фармальна. Будоўля і ўсё, што з ёю звязана, — або недастаткова арганічныя ў п'есе, або проста ўзяты занадта «дальнім планам», а на першым плане апынуліся «дробязі» быту. Справа тут, можа, нават не ў тым, што ў п'есе зашмат гэтых «дробязей». Як яны «абыграны» — вось у чым справа.

Абраныя сітуацыі вымагалі ад драматурга глыбіні псіхалагічных характарыстык персанажаў. Аднак у межах мноства намечаных аўтарам канфліктаў амаль ні адзін з іх не раскрыўся цалкам.

Нераспрацаванасць характараў прадвызначана няяснасцю аўтарскіх адносін да персанажа. Сапраўды, вось—Зорын і Люба. Зорын «не адрываецца ад зямлі», Люба «адрываецца ад зямлі». Што лепш? Што добра? Што дрэнна? Як мяркуе аўтар? Адказаць на гэтыя пытанні, следуючы логіцы п'есы, — наўрад ці магчыма.

Зорын, паводле дэкларацыі П. Васілеўскага, — чалавек складаны. Але ні перадгісторыя характару, ні матывы ўчынкаў яго нам невядомы. У абмалёўцы вобраза шмат супярэчнасцей. На самай справе, калі герой моцна прывязаны да зямлі, калі ён мяркуе, што трэба смела крочыць насустрач лёсу, дык чаму ж тады ён так нясмела ставіцца да свайго пачуцця, не жадаючы браць Любу з сабой на будоўлю? Драматургу, відаць, неставала рэальнага адчування Зорына як жывога чалавека, ён не здолеў узняцца да ўзроўню свайго героя і ў сэнсе прафесіі. Мы не бачым Зорына ў канкрэтных учынках, у моманты, калі ён прымае тыя ці іншыя рашэнні, якія хоць бы датычаць будоўлі. Усё гэта прыблізна, няясна акрэслена ў рэплініках персанажаў і ў зорынскіх «самахарактарыстыках». Чаму так здарылася, што ён «заваліў» справы? Больш таго, дэкларуючы неабходнасць смела крочыць насустрач лёсу, ён па сутнасці з'яўляецца нейкім «непраціўленцам», калі мы бачым яго ва ўзаемадачыненнях з Любай і жонкай. Стварацца ўражанне, што ён абсалютна бязвольны, бо робіць усё тое, што дыктуюць яму паперменна то адна, то другая. Прыязджае Люба — Зорын толькі пытае: навошта? — і ідзе ёй насустрач. Надзя раней пакідала яго. Значыць, і вярталася да яго. І, выходзіць, ён мірна пагаджаўся з гэтым, як пагаджаецца з уходам Надзі і ў апошні раз. Пасля Зорын пагаджаецца з ад'ездам Любы на вучобу (новы варыянт канцоўкі). Увогуле, ці любіць Зорын Любу? Атрымліваецца, што яна нібы камень у яго на шыі, калі яму трэба ісці на ўчастак; Люба патрабуе не пакідаць яе «ў такую мінуту», калі ідзе размова пра каханне. Тое, што мы ведаем з тэксту п'есы, не выключае розных, абсалютна процілеглых трактовак вобраза Зорына. Можна ўкласці зусім розны сэнс у многія яго ўчынкі. А хіба сам той факт, калі да п'есы можна «прышпіліць» спачатку адну, а пасля другую канцоўку, не сведчыць, што твор раскіданы? Выходзіць, і характар Любы таксама можа быць трактаваны зусім парознаму...

Але вернемся да Зорына. Можна думаць, што ён сапраўды ўзваліў сабе на плечы непасільную ношу з меркаваннямі далёка не «грамадзянскіх», але не справіўся, і ў выніку паламалася нават сямейнае жыццё, бо і кахаць ён не здолеў па-сапраўднаму. І тады стаў «прападаць на сёмым» участку.

Такое ўражанне ад Зорына асабліва ўзмацняецца, калі глядзіш спектакль. Зорын у выкананні Б. Уладамірскага — бязвольны, халодны чалавек.

Здольны акцёр Б. Уладамірскі не атрымаў неабходнага драматургічнага матэрыялу для стварэння пераканальнага сцэнічнага вобраза.

Аўтар п'есы, рэжысёр і акцёр спыніліся на парозе цікавага канфлікту ў душы Зорына, які мог бы быць. Дапусцім, Зорын—улюбёны ў справу, працуе з поўнай самаддачай, кахане для яго — дробязь. І вось ён сустрэў Любу. Больш тонка арганізаваная, чым Надзея, натура, Люба захапіла Зорына. (Пакуль жа невядома, чаму ён аддаў перавагу Любе — хіба што яна маладзейшая?). Але калі Люба «з мары ператварылася ў рэчаіснасць», яна павісла каменем на шыі. На гэтую думку наводзіць сцэна спектакля ў пакоі Зорына, калі ён збіраецца ісці на ўчастак. Сама па сабе мізансцэна тут знойдзена ўдала, але менавіта для дадзенай трактоўкі вобраза Зорына, якой, на жаль, не здолеў убачыць выканаўца.

Зорын варты жалю ў сцэне, калі яго пакідае Надзя. А ці так ён задуманы драматургам, калі меркаваць па выказваннях пра яго многіх персанажаў і па ягоных самахарактарыстыках? Да таго ж і ў спектаклі абсалютна няясна, ці кахае Зорын—Уладамірскі Любу, яго запэўненні мы прымаем на слова — яны не пацвярджаюцца логікай паводзін і ўчынкаў.

На слова прымаем мы і тое, што Зорын узяў ношу не па сіле, і голае адміністраванне, і што ён далей носу не бачыць, і што Любу кахае. І зноў жа не з логікі паводзін самога Зорына, а толькі з тэксту, які дэкламуе артыст.

Выканаўца ролі Веры Л. Давідовіч іграе каларытна. Адно толькі нядобра, што гэта **новая з серыі** амаль такіх жа «разбітных» дзяўчынак, якія створаны актрысай у шэрагу спектакляў.

Ёсць і іншыя недахопы п'есы, якія абумовілі недахопы спектакля. Тут і няўменне выкрэсліваць з твора лішняе, і бледнасць моўных характарыстык персанажаў, і ўяўная значнасць шэрагу канфліктаў і характараў, і занядбанне падтэкстам і паўтонамі. Большасць герояў гавораць адной мовай, якая не выяўляе іх характараў.

Каб дзеянне п'есы развівалася шырокім жыццёвым патокам, патрэбны сюжэтныя лініі і такія, якія ўзаемна перасякаюцца, і побач ідучыя, і паралельныя. Але якая ўдзельная вага кожнай з іх? П. Васілеўскі гэтага для сябе не вызначыў.

Як і п'еса, спектакль не мае выразнай тэмы, яснай думкі. Выканаўцы, паколькі матэрыял неасэнсаваны аўтарам, пазбаўлены яснай драматургічнай асновы для сваіх роляў.

З «трохкутніка» найлепш праводзіць сваю ролю Г. Арлова (Надзея). У адрозненне ад Б. Уладамірскага, ёй ясная перадгісторыя гераіні, яна іграе прадумана, мае сваю «звышзадачу». На жаль, паводле аўтарскай волі, яна вымушана вымаўляць і рэплікі, зусім не ўласцівыя малюнку ролі, які стварае актрыса.

М. Захарэвіч аднатонная ў ролі Любы, часта ў яе з'яўляецца нейкі зусім непатрэбны надрыў.

Артыст Ус. Былінскі шаржыруе Жура, завастрае сатырычную характарыстыку. Гэта вядзе да рознастылнасці спектакля, задуманага далёка не як камедыя.

Ролю Кораня выконвае П. Пекур. Пра яго ў гэтым спектаклі можна сказаць толькі, што ён добрасумленна пераказаў аўтарскі тэкст.

Шмат «аперэтачнага» ў «каскаднай» пары Нюра — Кісялёў (М. Громава, І. Лапцінскі).

Падсумоўваючы сказанае, дапускаючы, што заўвагі нашы, (прынамсі, многія з іх) могуць аказацца ў той ці іншай меры спрэчнымі, падкрэслім бясспрэчнае: «Любоў, Надзея, Вера...» — пакуль што чарнавік п'есы, якую П. Васілеўскі яшчэ павінен напісаць.

Ул. БОЙКА.

НОВЫЯ ВЕРШЫ

Антон БЯЛЕВІЧ

З ДОБРАЙ ДОЛЯЙ ЗАРУЧОНЫЯ

Вецер налятаў, кудлачыў крону,
На галіны цёплай плынню лез.
— Паляцім, таварыш, дуб зялёны!
— Не магу. Вартую гэты лес:

Ад цябе вартую, ад марозу.
Кожнаму я дрэву пабрацім...
І за рукі белую бярозу
Ухапіў вятрыска: — Паляцім!

— Адчапіся! Тут мая прапіска.
Нарадзілася, расла ў гаі.
Я для птушак — родная калыска,
Нас, бяроз, кахаюць салаўі.

Зашумеў на лузе ля дубровы:
— Паляцім далёка, мурагі!
— Нас чакаюць коні і каровы,
Ляжам у пракосы ды ў стагі.

З лугу пакаціўся проста ў рэчку,
У гусей чародку: — Паляцім!
— Мы плывём, нясём свае яечкі
Нашым гаспадыням дарагім.

З рэчкі праз чарот ён, праз ракіту —
У духмян жытнёвай паласы.
— Паляцім!
— Суціхні, валакіта!
Бачыш, я гадую каласы.

Пераскочыў тын. У сад імкліва
Уварваўся: — Сад, ляцім! Прашу.
— Я гадую вішні, бэры, слівы,
На галінах пчол я калышу.

Валачэцца вецер-недарэка.
Саслабеў,
Схмурнеў,
Змарнеў
Зусім.
На дарозе ўбачыў чалавека,
Да яго падскочыў:
— Паляцім!

Дзве рукі ў цябе, нібыта крылы:
Узмахні — ляці ў далёкі шлях!
Чалавек гаворыць: — Многа сілы
І вялікай мудрасці ў руках.

Тое ўсё, што бачыў вольны вецер,
Тое ўсё, што ёсць у белым свеце
На зямлі пад сонцам залатым,—
Зроблена рукамі.
Слава ім!

Уздымаць патрэбна працай славу.
Вандраваць,
Блукаць
Няма калі
Заручоным з доляю дзяржавы,
З хараством любімае зямлі.

САКРЭТ НЕСПАКОЮ

Падружка, шчыра прызнаюся,
Пачуццяў, думак не таю:
Сама сябе нібы баюся,
Сама сябе не пазнаю.

Ну, што такое? Што такое?
Ну, як жа гэта расказаць?
Гатова стаць, плысці ракою,
Дуброваю гатова стаць;

Гушкаць вясёлы спеў птушыны,
Сыпнуць напевы да нябёс;
Ляцець чародкай лебядзінай
На сінь азёр, на ціхі плёс.

Зрабіцца радугай гатова,
Стаяць над светлаю ракой,
Абняць бярэзнікі, дубровы,
Лугі, куток бацькоўскі мой.

Гатова грымнуць перунамі,
Маланкай чыркнуць паміж хмар;
Развеяць воблакі вятрамі, —
Такі ў душы маёй пажар.

Ну, што такое? Што такое?
Пачуццяў гэтакі палёт!...
— Сказаць прычыну неспакою? —
Любоў прыйшла ў семнаццаць год!

ТАНЦОРКА

Каснікі і кутасікі
Зацвілі,
Паплылі,
Калі дробна абцасікі
Выбіваць пачалі.

І ўсё шчоўкалі, шчоўкалі,
Як гарошыны, там.
Ногі лёгкія, лоўкія:
Мілата,
Любата!

І куды толькі дзелася
Вялата маіх ног.
Сыпануць захацелася
З-пад абцасаў гарох.

Хай пакоіцца з горачкі,
З клубнай сцэны ў сяло.
— Паглядзі, мая зорачка,
Колькі жару было!..

Толькі так не сказалася,
Не прытупнуў нагой.
Сэрца ўсё любавалася
Яснай зорачкай той;

Тою, што завіхалася
На жніве да цямна.
А як тут заспявалася, —
Стала песняй яна...

Скронь кранаў пасівелую,
Сумаваў, не таю:
Ах, шкада, што даспелую
Восень стрэціў сваю.

Толькі сэрцу не хочацца
У зацішак, у сон.
Па ім коціцца, коціцца
Тых абцасікаў звон.

НАРОДНЫМ ТЭАТРАМ — УВАГУ І ПАДТРЫМКУ

ПАСТАНОВА КАЛЕГІІ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР І ПРЭЗІДЫУМА РЭСПУБЛІКАНСКАГА САВЕТА ПРАФСАЮЗАЎ

У перадз'ездаўскія дні на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» на працягу трох месяцаў вялася творчая гаворка аб дзейнасці народных тэатраў нашай рэспублікі і шляхах іх далейшага развіцця. Было змешчана 16 артыкулаў рэжысёраў народных тэатраў, работнікаў абласных упраўленняў культуры і дамоў народнай творчасці, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, драматургаў і журналістаў. У ходзе дыскусіі адбыўся шырокі абмен думкамі аб творчых праблемах, якія стаяць перад народнымі тэатрамі Беларусі, аб недахопах у іх рабоце. Аўтары артыкулаў выказалі шмат каштоўных прапаноў.

На спецыяльным пасяджэнні калегія Міністэрства культуры БССР і прэзідыум Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў падвялі вынікі дыскусіі аб народных тэатрах, адзначыўшы добрае пачынанне газеты «Літаратура і мастацтва».

У прынятай пастанове яны абавязалі абласныя ўпраўленні культуры, абласныя саветы прафсаюзаў, раённыя аддзелы культуры і дамы народнай творчасці штодзённа клапаціцца пра далейшае развіццё народных тэатраў. Вядучае месца ў рэпертуары гэтых тэатраў павінны заняць лепшыя творы савецкай, у тым ліку беларускай драматургіі, якія адлюстроўваюць жыццё і працоўныя подзвігі савецкага народа — будаўніка камуністычнага грамадства.

Каб калектывы народных тэатраў маглі сістэматычна папаўняцца найбольш здольнымі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці, у наступным годзе пры народных тэатрах абласных цэнтраў будуць створаны школы-студыі. Кіраўніцтва работай гэтых студый ускладаецца на галоўных рэжысёраў народных тэатраў.

У сваёй пастанове калегія звярнулася з просьбай да Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі павялічыць прыём з 1962—1963 навучальнага года на рэжысёрскі факультэт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута па спецыяльнасці рэжысуры драмы да 30 чалавек і на мастацкі факультэт па спецыяльнасці мастацкага афармлення да 10 чалавек штогод.

Рэспубліканскаму Дому народнай творчасці даручана ў двухмесячны тэрмін падрыхтаваць і накіраваць народным тэатрам рэкамендацыйны спіс п'ес, а таксама праграму правядзення навучальна-выхаваўчай работы з аматарамі сцэны.

Рэспубліканскі Дом народнай творчасці павінен да 20-га студзеня 1962 года распрацаваць навучальную праграму заняткаў у школах-студыях; кожны год праводзіць дзесяцідзённыя семінары галоўных рэжысёраў і загадчыкаў пастановачнай часткі — мастакоў народных тэатраў на базе прафесіянальных тэатраў Мінска.

Рэспубліканскаму Дому народнай творчасці разам з абласнымі дамамі прапанавана прыцягваць майстроў прафесіянальнага мастацтва для аказання дзейснай дапамогі народным тэатрам у арганізацыі навучальна-выхаваўчай і творчай работы.

Абласныя ўпраўленні культуры і абласныя саветы прафсаюзаў разам з дамамі народнай творчасці абавязаны забяспечыць кваліфікаваны прыём спектакляў народных тэатраў. Прыёмачныя камісіі павінны складацца з работнікаў прафесіянальнай сцэны і прадстаўнікоў грамадскасці. Абмеркаванне новых спектакляў неабходна праводзіць на пашыраных пасяджэннях мастацкіх саветаў.

У пастанове прадугледжана правядзенне ў 1962 годзе абласных творчых канферэнцый галоўных рэжысёраў і актыву акцёраў народных тэатраў.

Дырэктары дамоў культуры павінны выдзяляць народным тэатрам рэпетыцыйныя памяшканні, а таксама прадастаўляць глядзельныя залы і сцэны, не менш, чым на пяць дзён у месяц, для правядзення рэпетыцый і паказу спектакляў.

Дырэктарам рэспубліканскіх і абласных тэатраў прапанавана ў межах устаноўленых працоўных норм прадугледзець пастаноўку аднаго спектакля ў год штатнымі рэжысёрамі ў народных тэатрах без дадатковай аплаты; прымаць у тэатры для індывідуальнага навучання работнікаў мастацка-тэхнічнага персаналу (грымёраў, бутафораў, касцюмёраў) па накіраванню абласных упраўленняў культуры.

Прафесіянальныя тэатры, у адпаведнасці з пастановай, павінны прадастаўляць народным тэатрам адзін раз у квартал памяшканні, не беручы арэнднай платы, для паказу на прафесіянальнай сцэне лепшых спектакляў народных тэатраў.

Вырашана правесці ў сакавіку-красавіку 1963 года ў Мінску агляд народных тэатраў—«Тэатральную вясну» пад дэвізам: «Наш сучаснік на сцэне народнага тэатра».

Прэзідыуму Беларускага тэатральнага таварыства прапанавана накіраваць работнікаў прафесіянальнага мастацтва для аказання дапамогі ў навучальна-выхаваўчай рабоце аматараў сцэны; разам з рэспубліканскім Домам народнай творчасці распрацаваць тэматыку лекцый па пытаннях мастацтва і забяспечыць правядзенне гэтых лекцый ва ўсіх народных тэатрах сіламі кваліфікаваных работнікаў прафесіянальнага мастацтва.

Вырашана прасіць Савет народнай гаспадаркі БССР, каб усіх артыстаў народных тэатраў, якія працуюць на прадпрыемствах рэспублікі, перавялі на першыя змены.

Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Ул. І. Леніна прапанавана па рэкамендацыі рэспубліканскага Дома народнай творчасці размножваць анатацыйныя спісы, а таксама асобныя аднаактовыя і многаактовыя п'есы беларускіх драматургаў для народных тэатраў і драматычных калектываў.

ХТО ШУКАЕ, ТОЙ ЗНАХОДЗІЦЬ

Ну, як тут не спыніцца ля кніжнай вітрыны «Мы ідзём да камунізма!» Загадчыца бібліятэкі Аляксандра Клеменцьеўна Лісоўская так цікава і захапляюча расказвае дзецям пра нашу светлую будучыню.

Фота Ул. Крука.

Я зайшла ў Мінскую дзіцячую бібліятэку № 2 Савецкага раёна ў панядзелак гадзін каля чатырох. Паўнютка было дзяцей і ў чытальнай зале, і ў аддзеле абанемента. Панядзелак — скарочаны дзень у бібліятэцы, яна працуе толькі да чатырох гадзін, але пакуль усе юныя чытачы не атрымалі сабе кнігі, ніхто з работнікаў не пакінуў свайго працоўнага месца. Затрымаліся амаль на гадзіну.

Дрэнна, вядома, калі парушаецца працоўны кодэкс. Але раз прыйшоў чытач за кнігай, значыць, яе трэба яму выдаць.

Чулыя, уважлівыя людзі працуюць тут. Гэта — загадчыца бібліятэкі Аляксандра Клеменцьеўна Лісоўская, загадчыца аддзела абанемента Нэла Сямёнаўна Сугака і бібліятэкар Алена Васільеўна Свірына, загадчыца чытальнай залы Таісія Яўгенаўна Гасюк.

Бібліятэка працуе з адкрытым доступам чытачоў да кніжнага фонду. Трэба ведаць непаседлівых і цікаўных школьнікаў, не кожнаму з іх дысцыпліна і строгі парадак на кніжных паліцах па душы. Але бібліятэчныя работнікі выконваць правілы карыстання кнігай навучылі кожнага юнага чытача.

Калі чытачоў прыходзіць многа, адразу з'яўляюцца добраахвотныя памочнікі. Яны запішуць у фармуляр кнігі, вызначаць шыфр аддзела, праверацъ, у якім стане здае вучань кніжку, і нават параюць, што пачытаць. Гэта — члены савета сяброў кнігі, многія з іх — вучні пятых класаў. Чаму менавіта гэтых класаў?

У мінулым навучальным годзе ў васьмі пятых класах 20-й і 73-й школ праводзіліся ўрокі бібліятэчна-бібліяграфічнай пісьменнасці. У праграму гэтых урокаў былі ўключаны гутаркі аб тым, што такое бібліятэка, як ёю карыстацца, аб выхаванні любві да кнігі, разглядаліся пытанні, як правільна навучыцца чытаць кнігу, выбіраць яе. Вучні пазнаёміліся з асновамі класіфікацыі літаратуры. Яны ўжо ведаюць, якую ролю адыгрывае каталог і як ім карыстацца. На ўроках ішла гаворка і пра піянерскі перыядычны друк, у тым ліку пра часопісы «Бярозка» і «Вясёлка». Заняткі з дзецьмі праводзілі А. Лісоўская, Т. Гасюк і Н. Сугака. Дапамагалі ім студэнткі бібліятэчнага аддзялення Мінскага педагагічнага інстытута М. Сярэбраная і Я. Літвін.

І вось цяпер у дзяцей як бы вытворчая практыка. У рабоце бібліятэкі ёсць шмат новага, цікавага, пра ўсё нават цяжка расказаць. Але на тым, як тут прапагандуюць беларускую кнігу, варта спыніцца больш падрабязна.

— Парада бібліятэкара, калектыўнае абмеркаванне кніг самімі дзецьмі, — гаворыць загадчыца бібліятэкі А. Лісоўская, — гэта ўжо традыцыя. Вучні ж любяць новае, свежае, і нам трэба заўжды быць у пошуках. Вырашылі, напрыклад, праводзіць у школе, бібліятэцы, а летам у парку імя Чалюскінцаў літаратурныя ранішнікі, якія назвалі «Жывыя анатацыі». Гэта своеасаблівы тэатралізаваны паказ. Хлопчыкі ці дзяўчаткі «апранаюць» маляўнічую вокладку кнігі, на якой напісана яе назва, аўтар, убачыш тут і малюнак мастака. Потым дзеці расказваюць змест кнігі, пра галоўных герояў і г. д.

Адна справа, калі пра кнігу раскажа бібліятэкар, настаўнік або хто-небудзь з бацькоў (і яны з'яўляюцца членамі савета бібліятэкі), і іншая, калі гэта робяць самі дзеці. Такія ранішнікі праходзяць надзвычай жыва, цікава і весела. Відаць, гэта і садзейнічае таму, што ў наступныя дні юныя чытачы самі пытаюць у бібліятэкара і «Мядовыя краскі» А. Рылько, і «Гіпсавую маску» П. Рунца, і «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі, і «Сіні домік, сіні дом» Н. Гілевіча, і «Шчаслівай дарогі» А. Александровіча, і «Ты не адзін» А. Пальчэўскага, і «Смелыя людзі» А. Якімовіча...

Многія прыклады гавораць, што бібліятэкары з вялікай любоўю прапагандуюць беларускую паэзію. І дзеці ахвотна яе чытаюць, завучваюць напамяць. У бібліятэцы з'явіліся свае прыхільнікі паэзіі А. Астрэйкі, А. Александровіча, Э. Агняцвет. А калі ў госці да юных чытачоў прыходзяць пісьменнікі—аўтары іх любімых твораў — гэта ўжо сапраўднае свята для школьнікаў. Такія сустрэчы бібліятэка наладжвае не толькі ў час тыдня дзіцячай кнігі.

Неяк зацікавіліся работнікі бібліятэкі пытаннем: а што чытаюць пяцікласнікі? Уважліва вывучылі кожны фармуляр. Што ж аказалася? Многа ахвотнікаў на тэхнічную, навуковую літаратуру, чытаюць творы рускіх савецкіх пісьменнікаў і кнігі беларускіх аўтараў. І значна менш было запісана твораў класікаў рускай літаратуры. Такое насцярожыла бібліятэкараў і паказала ім, што яны крыху занядбалі прапаганду гэтых твораў. Цяпер да фармуляра кожнага пяцікласніка прыкладзены ліст паперы, на якім надрукаваны спіс твораў рускіх класікаў, якія патрэбна прачытаць вучню. Калі гэтую справу ўзялі пад свой кантроль бібліятэкары, вынікі атрымаліся значна лепшыя.

Густы юнага чытача знаходзяцца пад неаслабнай увагай бібліятэкараў. На апошняй старонцы фармуляраў можна сустрэць такі запіс: «Любіць чытаць пра подзвігі піянераў у дні Айчыннай вайны». Або: «Цікавіцца літаратурай на тэму «Умелыя рукі»; «Чытае пра лётчыкаў»; «Любіць чытаць пра піянераў, пра тых, хто асвойвае бязмежныя цалінныя прасторы».

НОВАЕ у рабоце бібліятэк

Пры бібліятэцы працуе краязнаўчая секцыя. І яна згуртавала вакол сябе нямала юных піянераў. Яны вывучаюць свой родны горад, свой Савецкі раён, яго памятныя мясціны, прадпрыемствы, навучальныя ўстановы, сочаць, як забудоўваецца новы мікрараён сталіцы.

Разнастайная і змястоўная работа дзіцячай бібліятэкі. Гэтым і тлумачыцца, што яе кожны дзень наведваюць па 300 чытачоў, а бываюць дні, калі за кнігай прыходзяць 700 і больш вучняў. Толькі за адзін кастрычнік бібліятэка выдала сваім чытачам каля васьмі тысяч кніг!

Уяўленне аб бібліятэцы будзе няпоўным, калі не расказаць пра наглядную агітацыю, якая зроблена з тонкім густам, прыгожа і ярка. Ну, як тут не спыніцца ля кніжнай вітрыны «Мы ідзём да камунізма», у якой такія цікавыя раздзелы: «Што такое камунізм?», «Якія рысы будучага чалавека мы бачым сёння» і інш.

І апошняе: у бібліятэцы надзвычай чыста, утульна, светла і прыгожа. Невялічкі, дружны калектыў гэтай бібліятэкі праводзіць вялікую работу, каб дзеці на ўсё жыццё пасябравалі з кнігай, каб яна стала іх верным другам і дарадчыкам.

А. КАЛЯДА.

На паліцы перакладаў

СТАВІЦЦА ПЫТАННЕ АБ ШЧАСЦІ

Д. ФАКТАРОВІЧ

У станаўленні і развіцці літаратуры сацыялістычнага рэалізму за мяжой выдатнае месца займае добра вядомы многанацыянальнаму савецкаму чытачу пісьменнік Андрэ Стыль. За апошнія гады ён бярэцца за тэмы, якія найбольш хвалююць сучаснікаў, шукае і знаходзіць іх арыгінальныя эстэтычныя рашэнні. Бясспрэчна, што як у Францыі, так і за яе межамі ў нашы дні пытаннем усіх пытанняў з'яўляецца жудасная, крывавая, фашысцкая па метадах і імперыялістычная па мэтах вайна ў Алжыры. Пра яе пішацца багата. Нямала пішацца і публікуецца неакаланіялісцкіх твораў, прыпраўленых нейкай порцыяй «непазбежных» для чалавецтва жахаў. У гэтых, з дазволу сказаць, творах вайна паказваецца калі не як свята, дык як непазбежнае зло. І мае рацыю герой-журналіст Анры Алег, які піша, што зло алжырскай вайны дваякае: яно абарачваецца і супраць свабодалюбнага алжырскага народа і супраць таго пакалення французаў, якіх разбэшчваюць на гэтай вайне, штурхаюць у бездань злачынстваў супраць чалавечнасці, вучаць забыць усё сапраўды чалавечае.

Пісьменнік-камуніст А. Стыль працуе над цыклам раманаў і аповесцей аб чалавечым шчасці. Пасля таго, як ён звярнуў на сябе ўвагу Л. Арагона выразным групавым партрэтам докераў у рамане «Першы ўдар», А. Стыль пайшоў значна далей па шляху індывідуалізацыі і псіхалагічнай паглыбленасці паказу сучаснага юнацтва, тых, каго прызываюць у армію і гоняць на смерць якраз тады, калі іх кліча жыццё...

У цыкле раманаў і аповесцей «Ставіцца пытанне аб шчасці» пісьменнік паказвае нам драму душы сучаснага пралетарскага юнацтва, якое не хоча быць толькі ахвярай славутых планаў «уцікамірвання Алжыра», не хоча быць і страчаным пакаленнем, для якога ўсё ў жыцці аднолькава абрыдла,—як гавораць буржуазныя сацыёлагі, псіхолагі і маралісты.

З цыкла аб шчасці вылучаецца раман «Любіць будзем заўтра», які стаў, дзякуючы перакладу Ю. Гаўрука, не толькі здабыткам беларускага чытача, але і фактам нашай літаратуры як кожны глыбокі сапраўды мастацкі пераклад.

Перад намі нібы аповесць аб першым каханні. І разам з тым вельмі многае ў ёй пераклікаецца з самымі жорсткімі старонкамі «Агню» А. Барбюса і рэпартажу А. Алега. Без ценю сентыментальнасці перакладчык паказвае абстаноўку і абуджэнне маладых пачуццяў.

Металіст Раймон пакахаў краўчыху Анні і вельмі немнагаслоўна, сапраўды кранальна, нявінна прызнаўся ёй у гэтым на месцы іх спатканняў—зялёным востраве затокаў ракі Эско. Там жа закаханым даводзіцца разлучыцца — Раймона прызываюць несці службу ў Алжыры. І вось паміж Раймонам і Анні не толькі некалькі гадоў ростані, але і ўсё тое, у чым давялося ўдзельнічаць французскаму салдату, усё тое, што павінна было абудзіць і выхаваць у ім звера, падавіць Чалавека...

Раймон вяртаецца на радзіму, у бацькаў дом, да сваёй Анні цэлы і здаровы. Аднак так можа здацца толькі на першы погляд. Ён вярнуўся надламаным і ўзрушаным. Хваравіта рэагуе ён на сустрэчу з землякопамі, якія капаюць траншэю, на пахі шакаладнай фабрыкі, нават на запальнічку напарніка ў змене—усё гэта і, вядома, больш за ўсё радыёперадачы нагадваюць яму Алжыр. Яго трасе ліхаманка ад слова «забойцы». Ён абзывае гэтым словам усіх, вяртаючыся з шынка... Ён сапраўдны чалавек, і гвалтаванні ў Алжыры не дазваляюць яму жыць поўным жыццём на радзіме. У другой частцы свайго твора А. Стыль бачыць цэнтр яго цяжару. І Ю. Гаўрук, у якога і багатая эрудыцыя ў тэорыі мастацкага перакладу, і плённы вопыт перакладаў класікі, падышоў да гэтых старонак сучаснага французскага пісьменніка ва ўсеўзбраенні, ён пранік у аўтарскую задуму. Т. Саверы зазначыў, што перакладчык павінен мець на ўвазе: 1) што сказаў аўтар, 2) што ён хацеў сказаць, 3) як ён гэта выказаў. Іншымі словамі: мастацкі пераклад,—каб быць такім,—павінен не абстрагавацца ад дыялектыкі задумы і выканання, ад індывідуальнасці мастацкага стылю арыгінала. Усё гэта вельмі важна памятаць, калі мы задаемся ацэнкай адэкватнага і разам з тым творчага перакладу Ю. Гаўрука. Пераклад першых твораў А. Стыля быў абцяжараны тым, што аўтар злоўжываў дыялектызмамі, арго і прафесіянальным жаргонам. Ад усяго гэтага ён у значнай ступені пазбавіўся з гадамі.

Але яго проза не стала элементарнай або газетнай, як яе хацелі б называць эстэты. У апошніх творах А. Стыля, як правільна адзначыў у пасляслоўі да перакладу Ю. Гаўрук, яго проза набывае вельмі часта паэтычны лад. Справа тут не ў рытмах, не ў стварэнні ўзвышанай прыгажосці, а ў эмацыянальнай нагрузцы на слова, у лёгкасці, у віртуознай свабодзе пісьма. Два-тры штрыхі—і перад вамі, як ручай, як рака, плывуць, мяняюцца фарбы, гукі, людзі, настроі... Але наш перакладчык сціпла змоўчаў у сваёй ацэнцы цяжкасцей перакладу адну важнейшую асаблівасць арыгінала, а іменна яго шматпланавасць, своеасаблівую паліфанічнасць. У рамане апавяданне ідзе як ад імя аўтара, так і ад імя героя. У апавядальную тканіну рамана натуральна ўплятаецца і ўнутраны маналог, і тое, што на Захадзе называюць «патокам чалавечай свядомасці». У рамане ёсць роздум уголас і роздум без слоў. Перакладчык шукае і знаходзіць ім выразныя адпаведнасці. Усё тое, што Раймон перажывае як зробленае або перажытае ў Алжыры, «накатваецца» на яго і пазбаўляе раўнавагі, сіл, здольнасці проста жыць у бацькоўскім доме, нібы нічога не адбылося; проста кахаць Анні, нібы ён вярнуўся з манеўраў. Для эстэтычных пошукаў А. Стыля і ўсёй літаратуры сацыялістычнага рэалізму ў Францыі гэтыя старонкі маюць прынцыповае значэнне.

А. Стыль смела пайшоў на паказ узрушаных глыбінь чалавечай свядомасці. І тут А. Стыль не знайшоў звера ў чалавеку, як гаварылі дэкадэнты і спрабавалі паказаць мадэрністы ад усяляких «ізмаў». Герой А. Стыля—Раймон—юны пралетарый, які пакутуе ад усяго таго бесчалавечнага, што навязваецца яму імперыялізмам. Увесь лад думак і пачуццяў Раймона ў перадачы Ю. Гаўрука глыбока чалавечны пры ўсёй сваёй прастаце. Гэты юнак паўстае жывым са старонак рамана. У «патоку яго свядомасці», нават хваравітай і надламанай, востра адчуваецца сум па дастойнаму чалавека жыццю, па тым заўтрашнім дні, калі, зненавідзеўшы забойцу, можна будзе зноў навучыцца кахаць. Пераклад гэтых мясцін рамана—трэба пагадзіцца з Ю. Гаўруком — задача даволі складаная. Перакладчык прапанаваў арыгінальнае, вынашанае і пераканаўчае рашэнне, якое даносіць да чытача галоўнае і асноўнае, у тым ліку і ў аступленнях і ў фрагментах «патоку свядомасці», і ў снах Раймона, і ў падтэксце нявыказанага ім пры размовах з маці, з каханай дзяўчынай, з бацькам, з таварышамі. Перакладчык схіляецца да таго, каб падаць паток унутраных разважанняў шрыфтавым выдзяленнем—набраць курсівам, нібы гэта словы і не героя, і не самога аўтара, а таго пакалення маладых французскіх салдат, якіх кінулі ў мясарубку каланіяльнай вайны. І адсюль апраўданы аб'ектывізаваныя ўнутраныя маналогі. Знаходкамі перакладчыка гучаць трапныя прыказкі, пагаворкі, прымаўкі. («Вам вадзічкі—з вядра ці з крынічкі?», «Злодзей крадзе, а памагаты пад акном стаіць», «Гладзілі навічкоў па шэрсці».) У асобных выпадках перакладчык не даводзіць гэтыя выказванні да афарыстычнай чаканкі («праз тыдзень накапалі ім у мазгі»), а ў некаторых месцах некалькі развівае маналогі за кошт апісальнасці (стар. 122—123, 128—129, 138), відаць, так разумеючы сваю задачу: «быць прадстаўніком аўтара перад грамадскасцю». Але чытачу трэба больш давяраць! Асабліва тады, калі ідэйныя задачы вырашаюцца эстэтычнымі сродкамі. Пачынаючы ўжо з назвы твора, Ю. Гаўрук абдумана самастойны, незалежны. Ён адхіляе назву рускага перакладу твора—«Мы будем любить друг друга завтра». Нашто гэтае «друг друга»? Дзеля граматычнай дакладнасці, якая яўна звужвае задуму аўтара. Мы будзем кахаць, калі палюбяць адзін другога нашы народы,—пісаў адзін французскі крытык. Мы будзем кахаць, калі пераможам нянавісць і вайну. І перакладчык знаходзіць лагічнае вырашэнне: «Любіць будзем заўтра».

Новы раман А. Стыля ў перакладзе Ю. Гаўрука абуджае вялікія думкі і пачуцці, бо паміж аўтарам і чытачом стаіць сапраўдны майстра-перакладчык. Беларускае дзяржаўнае выдавецтва зрабіла вельмі добрую справу, што дало ў рукі чытачу на роднай яго мове актуальны раман аб лёсе заходняй моладзі перад тварам каланіяльных войнаў. Раман знайшоў свайго чытача, ён не на паліцы, а ў чытанні, у гарачых спрэчках.

З ПРЫВАТНЫХ КАЛЕКЦЫЙ

У памяшканні Дзяржаўнага мастацкага музея БССР адкрылася выстаўка твораў рускага мастацтва, якія належаць прыватным калекцыянерам Масквы і Ленінграда. Экспануюцца творы майстроў XVIII — пачатку XX стагоддзяў.

Наведвальнікі бачаць работы вядомых рускіх партрэтыстаў XVIII ст. Д. Лявіцкага, В. Баравікоўскага, а таксама многіх невядомых жывапісцаў. Прадстаўленыя на выстаўцы работы адрозніваюцца глыбокім рэалізмам, як і ўсе партрэтныя творы гэтай эпохі, якія менш за ўсё абмежаваны акадэмічнымі рамкамі ўмоўнасцей.

З некаторымі жывапісцамі канца XVIII—першай паловы XIX ст. ст. знаёмішся па работах, блізкіх венецыянскай школе, характэрнай сваім дэмакратызмам, верным адлюстраванням жыцця простага народа. Гэта — творы невядомых мастакоў: «Сялянка з дзецьмі», «Дзяўчына ў какошніку» і іншыя. Буйнейшы мастак рэалістычнага партрэтнага жывапісу В. Трапінін прадстаўлен партрэтам князя Абаленскага, а І. Аляшкевіч, які нарадзіўся на Беларусі, — «Жаночым партрэтам».

Палатно буйнейшага марыніста І. Айвазоўскага «Апошні ўздых карабля» расказвае пра шторм у моры, з якім змагаецца мужны чалавек. З пейзажаў варта назваць «Від у Мінскай губерні» Н. Атрыганьева, «Від каля Каіра» Н. Чарняцова, «Поўдзень» В. Арлоўскага, цікавую работу І. Шышкіна «Хваёвы бор. Сестрарэцк» і іншыя.

Добра паказана творчасць мастакоў другой паловы XIX ст. Тут экспануюцца шэсць работ В. Макоўскага—«Палітыкі», «На працу», «Прадавец піражкоў», «Спатканне», якія вылучаюцца глыбокім веданнем народнага жыцця, вострай назіральнасцю мастака.

Аб майстэрстве І. Рэпіна — партрэтыста гавораць вядомыя яго партрэты княгіні М. Ценішавай і артысткі М. Андрэевай, якія таксама выстаўлены ў экспазіцыі.

Багата прадстаўлены на выстаўцы творы мастакоў канца XIX і пачатку XX стагоддзяў. Тут і сонечны «Летні пейзаж» А. Васняцова і рэалістычныя пейзажы Л. Туржанскага («Восень», «Зіма на вёсцы», «Ранняя вясна»). Тонкі лірык і каларыст І. Левітан паказаны двума цікавымі пейзажамі «Асінавы гай» і «Касцёр», якія нядаўна экспанаваліся на левітанаўскіх выстаўках у Маскве, Ленінградзе і Кіеве.

Прыцягвае ўвагу работа Ф. Малявіна «Сялянка ў чырвонай сукенцы», дзе мастак поруч з майстэрскім напісаннем адзення здолеў паказаць своеасаблівы характар рускай жанчыны.

Многімі цікавымі работамі прадстаўлен і майстар малюнка, жывапіснага і графічнага партрэта В. Сяроў. Надзвычай свежая яго работа «Адчыненае акно. Бэз». Унутраны свет чалавека добра раскрыты В. Сяровым у партрэце юнай Гучковай і ў вобразе гордага і парывістага В. Мека.

Сярод пейзажаў гэтага перыяду многа работ розных мастакоў, якія разумеюць прыроду па-свойму і з вялікім майстэрствам перадаюць яе прыгажосць. Ураджэнец Беларусі С. Жукоўскі ў сваіх «Інтэр'ерах» здолеў паказаць прыгажосць хатняга быту і свежасць, лірычнасць прыроды, якая відаць праз адчыненае акно.

Выстаўка рускага мастацтва з прыватных збораў, якая ўпершыню экспануецца ў Мінску, выкліча вялікую цікавасць нашай грамадскасці.

Р. БАДЗІН.

В. ПЯРОЎ. «Чарга ля басейна».

Эдуард КАРПАЧОЎ

На Дняпроўскіх разлівах

АПАВЯДАННЕ

НА ПРАДВЕСНІ, калі прэла пахне паветра, у гумовых рыбацкіх ботах выходзяць на Дняпро Піліпка і Дораш. Яны дабіраюцца да сярэдзіны ракі і, цяжка дыхаючы, стаяць на прасторы, азіраюцца: ззаду—сярод вербалоззя — Кляновіца, а перад вачыма — лугі, якія вартуе Дораш.

Лёд голы і коўзкі, амыты першай талай вадой. Ён адсвечвае чыстай нясмелай прозеленню, і саннага следу на рацэ ўжо не відаць.

Піліпка радасна і здзіўлена пакрэктвае: да таго свежа адчуваецца вясна, сакавік! Яму, высокаму, нялёгка ўтрымацца на мокрым лёдзе, і ён увесь час дробненька пераступае з нагі на нагу, трымаючы напагатове растапыраныя рукі. Вецер настойліва абвявае твар, засцілае вочы слязьмі. Піліпка выцірае іх сагнутым пальцам, зноў наіўна дзівіцца ветру, зеленаватаму ільду, сакавіку і збівае на патыліцу цёплую аблавушку з адной доўгай, як шнурок, цясёмкай.

— Рыбачыць хутка,—задуменна, нібы не сабе і не Дорашу, а ветру гаворыць Піліпка.—Хутка!...

— Ды не, браток, рана,—адводзячы ад вачэй далонь, гаворыць Дораш.—Во, глядзі!—І ён моцна б'е абцасам па лёдзе. Ляцяць пырскі, а лёд не ўгінаецца, не разбягаецца цёмнымі расколінамі, а маўчыць.

Абодва разумеюць: Дораш гаворыць не тое, што думае. Для яго заўсёды пуціна: і ў лёдастаў, і ў паводку, і ў сонца, і ў асеннюю слоту. Ён прыжыўся на беразе ракі, як старое моцнае дрэва, і Дняпро шчодра надзяляе яго сваімі дарамі. Па ўсім верхнім Дняпры ведаюць, што ў Кляновіцу Дораш вяртаецца заўсёды з багатым уловам, ад якога аж тоне лодка...

А ад Піліпкі адвярнулася рыбацкая ўдача. Ён часта прычальвае да берагу з пустымі рукамі. Ды не гоніцца ён за рыбацкім шчасцем. Яму б толькі жыць на Дняпры, начаваць у сене або ля патухлага сумнага вогнішча, веславаць на золку, выкіроўваючы лодку ў лазняковыя затокі.

Недзе там, за лугамі, на чыгуначным мосце, натужна гудзе паравоз.

— Чак-чак-чак!—даносіцца выразны перастук колаў, пад які хочацца думаць аб дарогах, аб жыцці, аб хуткім ледаходзе.

Вясеннія клопаты зноў прачынаюцца ў Піліпкі і Дораша, быццам абуджаныя гэтым невідочным поездам. Піліпка думае аб тым, што ён, як і Дораш, таксама амаль калгасны вартаўнік. Дораш вартуе бясконцыя прыдняпроўскія лугі, а ён—палявы аб'ездчык. Не паспееш азірнуцца, як задыміцца ўзараная чорная пляма, і тады Піліпку ўсе дні калыхацца на цёплым крыжы рыжага Гарцуна.

Вяртаюцца яны з Дняпра ланцужком, першым ідзе Дораш. Ён пазірае на сваю хату пад кручай, якая здалёку віднеецца чатырма ражкамі тэлевізійнай антэны. Побач—Піліпкава хата, без антэны.

— Залье нашы агароды,—заклапочана гаворыць Дораш, калі яны падыходзяць да хат.

— Шапку трэба купіць,—уголас вырашае Піліпка.

— І як ты з ёю саўладаеш, з вадою, га? Вада, і ўсё!

— Цёпла, прыгрэе хутка,—разважае Піліпка.—Шапка патрэбна.

Ён задзірае галаву, аблавушка валіцца за спіну. Неба яшчэ без сонца, але ў нясцерпна белых воблаках.

* * *

Ранняя бурлівая паводка застае Дораша быццам знянацку. І маторная лодка, і човен ёсць у яго рыбацкай гаспадарцы, але Дорашу ўсё здаецца, што трэба змайстраваць лодку і лёгкія вёслы да яе.

Усяго нарыхтавана ў запас: жоўтыя дошкі, смала. З самай раніцы майструе лодку Дораш і яго сын Васіль—рослы хлапец у выцвілай салдацкай форме. На падсохлым двары выцягваецца хрыбет лодкі. Паступова ён абрастае свежымі пукатымі бартамі, і Дораш адчувае, як горача ёкае сэрца—нібы ў час шчодрай здабычы...

Апоўдні на двары з'яўляецца Піліпка. Садзіцца на шурпаты нагрэты корч, глядзіць, як спрытна працуюць Дорашы, як старэйшы з іх, прыжмурыўшы вочы, прыцэльваецца да дошкі, коратка кідае на яе рубанак. А малодшы разумее бацьку з аднаго кіўка і падсабляе яму ўмела, без мітусні: падае планку, цвікі і сам гоніць пакручастую габлюшку. «Жылісты, як бацька,—думае Піліпка.—Такі самы крутаплечы, і нават ходзіць, як бацька,—з цяжкай развальцай дужага чалавека».

Пахне смалой, вільготным дрэвам; двор усыпаны габлюшкамі, быццам прайшлася тут маленькая запозненая завіруха.

Падабаецца Піліпку па-вясноваму маладая ўтрапёнасць суседа. Толькі не разумее ён, навошта Дорашу гэта новая лодка? Дняпро багаты на стагоддзі, і ўсёй рыбы не пераловіш! Яму, Піліпку, і на адной старой пласкадонцы вунь які прастор плаваць.

Ходзіць-ходзіць Піліпка вакол суседзяў, топча габлюшку, а потым, не стрымаўшыся, гаворыць:

— Усё адно на ланцугу будзеш трымаць. І замок заіржавее...

— У гаспадарцы спатрэбіцца,—не даючы рукам адпачыць, глуха адказвае Дораш. — Няхай расце флатылія. Флатылія, браток!

Папляваўшы на далоні, ён выбірае малады бярозавы кругляк, прыкідвае, з якога канца пачаць часаць вясло.

— Мы з табой паедзем рыбачыць пад суботу, — выпростваецца Дораш.

Сусед ахвотна падхоплівае:

— А то як! Жывём, плаваем, а ніколі разам не збіраліся...

— Паедзем, паедзем, — хмурыцца Дораш. — Раненька... Я табе ў шыбу пастукаю...

* * *

Світае.

Піліпка чакае ўмоўленага стуку ў акно. Чуваць, як вяла шапоча, усплёсквае вада. Гэта зусім побач — працягні руку. Аканіца парыпвае адналстайна, быццам уключына ў лодцы.

Гадзіна, і яшчэ гадзіна праходзіць у чаканні, і ўвесь гэты час Піліпка ловіць чуйным вухам плёск вады, скрып аканіцы.

Апрануўшыся, ён ідзе ўзмежкам да прыбярэжных каменняў, мыецца халоднай, як лёд, вадой. Разліў ляжыць перад ім, як велізарнае возера: затапіла і выган, і далёкі, зарослы лазой курган, луг аж да самага берагу. Затапіла на добрую чвэрць і тэлеграфныя слупы.

Піліпка пераводзіць позірк на калочкі, да якіх звычайна прывязвае Дораш лодку і човен. Цяпер яны быццам асірацелі — каля іх няма ні чоўна, ні лодкі. Не верыць Піліпка сабе, зноў разглядае іх. І калі пераконваецца, што пры беразе няма нічога, акрамя маўклівых дый мокрых калочкаў, міжвольна вырываецца з грудзей горкі сіпаты голас:

— Эх!

«Не пастукаўся, — разславаўшыся, думае ён, і неахвотна цягнецца да чужога двара. — Збаяўся. А чаго баяцца? Ці ж я перашкода яму на Дняпры?»

Апускаючыся на корч, нявесела, абыякава глядзіць на новую, аблітую дзягцярна-чорнай бліскучай смалой лодку, якая сохне сярод двара.

І калі аднекуль збоку даносіцца прыглушаны і часты, як звон коніка, рокат матора, Піліпка пазнае: вяртаецца з лову сусед. Усё бліжэй, усё мацней ракоча матор, і вось, нарэшце, з-за карычневых кустоў вырываецца знаёмая лодка. Пласкадонка носам напаўзае на берагавую водмель. Навошта Піліпку спяшацца насустрач Дорашам? Яны самі—бацька і падобны да бацькі Васіль — спяшаюцца дадому, згінаючыся пад цяжарам кошыкаў.

— Браток! — стомлена, з хваляваннем крычыць яму Дораш.— У Гіраўскіх канавах — кішмя рыбы!..

Піліпка насуплена маўчыць, у ім востра прачынаецца рыбацкі запал. І ўжо быццам пачынае расцякацца па крыві травяністы пах сетак, свежай прэснай лускі.

Рыбакі рассцілаюць брызент, вывальваюць на яго ўвесь багаты ўлоў. А потым Дораш, паставіўшы перад сабою круглыя кошыкі, бярэцца сартаваць рыбу: дробную — туды, большую — сюды...

І бачыць Піліпка процьму малой рыбкі. Значыць, лавілі яе без разбору, недазволенай густой мярэжай. Піліпка і сам рыбак. Ён строга прытрымліваецца рыбацкіх законаў, і таму не можа цярпець драпежнікаў на рацэ.

Устае ён і з болем пытаецца:

— Навошта ловіш мальву? Эх, Дораш... Хапуга — інакш не назавеш цябе!..

Дораш не адказвае. Дробную—туды, буйную — сюды. Дробную—туды, буйную — сюды...

І калі з Васілём, падхапіўшы кошыкі і зноў прысядаючы, брыдзе да лодкі, Піліпка са злосцю ўсклікае:

— Куды?

— А туды! — нядобра смяецца Дораш.

Васіль застаецца на беразе, а ён, сагнуўшыся, заводзіць бурклівы матор, плаўна вырульвае лодку ў бок райцэнтра, дзе на прыстані, на рыбным базары, раніцай стаіць гоман.

* * *

Сонечна, горача — хоць кладзіся на зямлю. Усе гэтыя дні Піліпка ў полі, скача на Гарцуне па раллі, аб'язджае прасторы і быццам нанова пазнае свой прыдняпроўскі край. Конь шалее ад душнага горкага паветра, лёгка носіць на сабе конніка...

І нават калі Піліпку даводзіцца стаць за ўчотчыка, ён не разлучаецца з Гарцуном, прыходзіць у стайню рана, ні свет ні зара, сам чысціць каня, поіць і конна адпраўляецца пад Чарнянскі лес. Стрыножыўшы Гарцуна на ўзлеску, дзе ў ярах праз гнілое леташняе лісце прабіліся тонкія, як хваінкі, травы, Піліпка выбіраецца з «казой» у руках на голас трактара.

Трактарыст Сярожа будзіць зямлю, і яна — вясновая, галодная — вывальваецца на свет свежымі барознамі. «Насыцішся, — у думках гаворыць ёй Піліпка, ідучы за трактарам, замяраючы раллю, запісваючы ў сваім блакноціку радкі лічбаў. — Як сыпанём зярнятамі, дык адразу і насыцішся». Ён зайздросціць цяпер Сярожу ў новенькім камбінезоне, са здзіўленнем пытаецца ў сябе: адкуль гэта? Потым вырашае, што ніякай зайздрасці няма, проста сэрцу вясной усё чагосьці нестае, усё яму хочацца жыць шырэй, хутчэй... Хоць Сярожа і малады, а Піліпку думаецца, што калі б ён перасеў на трактар, то не адстаў бы ад Сяргея, араў бы таксама да ночы пры пражэктаравым святле фараў: гудзяць, дужэюць на красавіцкім паветры старыя рукі!

Пакінуўшы трактар, Сярожа саскоквае на зямлю з хатыльком у руках. Развязвае хустачку, ломіць акраец хлеба, выцягвае папяровы корак з вялікай бутэлькі з-пад шампанскага, напоўненай малаком.

Смачна есць рабочы чалавек! Хрумсціць хлебная скарынка, крошкі, якія ўпалі на далонь, не прападаюць марна, і мякка булькае малако, якое п'е чалавек з рыльца бутэлькі.

На секунду Сярожа замірае з поўным ротам, глядзіць на Піліпку.

— Еш, еш! — махае абедзвюма рукамі Піліпка.

— Ага, вось аб чым хачу сказаць, — успамінае трактарыст. — Цікавы ў цябе сусед, Піліпка. Тэлевізар у яго ў аднаго ў Кляновіцы, так?

— Так.

— А чаму ён у клуб кіно глядзець ідзе без білета? Не ведаеш? Я таксама не ведаю. Надоечы падыходзіць да кіншчыка: «Тэлевізар сёння выхадны, дык я сюды». Кіншчык гаворыць: «Возьміце білецік, грамадзянін». А Дораш: «Я да цябе бясплатна, і ты да мяне таксама бясплатна прыходзь на тэлевізар». Прайшоў нахабна.

— Хапуга! — перабівае Сярожу Піліпка і адводзіць вочы, потым хутка ідзе па раллі ў бок лесу — быццам хоча глянуць на Гарцуна.

Думаць пра Дораша не хочацца, але на сэрцы становіцца цяжка, быццам сабраліся адна да адной усе крыўды на суседа, сабраліся і не адступаюць.

Піліпка ведае даўно, што ў Дораша — ненажэрныя, заграбушчыя рукі. Але раней ён стараўся не заўважаць нядобрай хцівасці Дораша, імкнуўся жыць з ім пасуседску, без сварак. А цяпер адчувае, што не выходзяць з галавы нядобрыя справы суседа, жыве, да болю раніць тая, нядаўняя рыбалка, калі знішчыў Дораш драбязу. Ненавісныя яму і чатыры ражкі тэлевізійнай антэны, і новыя вёслы Дораша, і хлеў яго, асветлены электрычнымі лямпачкамі.

А яшчэ турбуе Піліпку сорам. Чужы для яго Дораш, чужы для ўсёй Кляновіцы, а нічога не зрабіў Піліпка, каб перавярнуць, парушыць жыццё суседа...

Да вечара Піліпка на полі. Пакідае Сярожу, скача на прыбярэжныя ўчасткі. Зямля вялікая, Дняпро — бясконцы, і адчувае ён сябе гаспадаром гэтага вясновага краю. Дораш аднойчы выхваляўся, што ён таксама гаспадар усіх прыдняпроўскіх лугоў. Які ж гаспадар Дораш? Мінулым летам, калі ў навальніцу спаліла маланкай чатыры стагі, Дораш не сказаў ні аднаго шчырага слова. Маўляў, маланка, і ўсё! А на рыбалку ён збіраецца — ого! — з якім хваляваннем! Свайго карыта гаспадар Дораш!

Няма, нічога няма суседскага ў Піліпкавым сэрцы да гэтага рыбака. Так вырашае ён пад вечар ужо, калі ўлягаюцца ўсе дзённыя трывогі.

І калі вяртаецца дадому, ля веснічак яго спыняе знаёмы голас, які пратрубіў, здаецца, сёння яму ўсе вушы:

— Братка! Не быў на Гіраўскіх канавах?

Стыне ў Піліпкі ў горле звыклае «добры вечар». Не адказвае ён і праходзіць, не прывітаўшыся.

* * *

У карме ляжаць два шчупакі. Іх злавіў Піліпка на спінінг.

Вербы, і сонца, і берагавая круча — усё нібы задумалася перад вячэрнім спакоем. Дзень адыходзіць, быццам сумуючы па самім сабе — блакітным, гаманлівым.

Піліпка вяслуе мерна, асцярожна. Яму не хочацца парушаць усплёскамі гэтай чыстай задуменнасці. І на душы ў яго таксама насцярожаная задуменнасць: здаецца, цяпер лёгка адгадаеш, дзеля чаго ражыў дзень, дзеля чаго вяртаюцца ў родныя гнёзды птушкі, разліваецца паводка, звініць па Дняпры вясна...

Ужо каля самага берагу ён заўважае Дораша. Сусед рыхтуе лодку, але Піліпка чамусьці не бачыць прывычных воку прылад: ні сетак, ні падсак.

Няўжо проста так, на прагулку адпраўляецца Дораш? Скажаш аб гэтым у клубе — ніхто не паверыць...

Але вось сусед асцярожна кладзе ў лодку цяжкі брызентавы чахол. «Ружжо!» — пранізвае Піліпку здагадка, і лютая непрыязнь да суседа налівае рукі нервовай сілай, ён хуткімі ўзмахамі, рыўкамі набліжаецца на лодцы да берагу.

Барты лодак суха стукаюцца, і Дораш ад нечаканасці падае каленам на днішча.

— Не чуў, Дораш? — глуха, паспешліва гаворыць Піліпка. — Забаронена веснавое паляванне. Сёлета па ўсім Дняпры забаронена...

Дораш ловіць яго позірк, імгненна напружваецца, жмурыць вочы — толькі валявяна блішчаць шчылінкі.

— А гэта вясло, — спакойна гаворыць ён, быццам з насмешкай просіць прабачэння. — У запас. Ну, Піліпка, няма часу мне.

«Ружжо!» — стукае настойлівая думка. Значыць, збіраецца Дораш на браканьерскае паляванне кудысьці на азярцо або на Гіраўскія канавы, і да самай ночы будзе цягнуць адтуль, з вярхоўя, вострым пахам дыму, а хваля прыб'е да берагу карычневае і белае пер'е.

— Варочай дадому, Дораш, — гаворыць, ссутуліўшыся, як для скачка, Піліпка. І, сапраўды, скача за борт, па калені ў ваду, і Дорашаву лодку штурхае, вядзе кармой на водмель. Дораш, быццам нічога не заўважаючы, заводзіць матор. І толькі калі вінт матора шуршыць аб пясок, ён крута паварочваецца і са злосцю замахваецца вяслом:

— Заб'ю! Зараз заб'ю!

— Нікуды не паедзеш, Дораш! А паедзеш — пазваню ў райцэнтр, выклічу інспекцыю, — адказвае Піліпка і выплёўвае ваду, якую хлябнуў незнарок.

Дзікімі, лютымі вачыма глядзіць на яго Дораш, губы ў яго дрыжаць і, разумеючы, што ўпершыню ў жыцці яму не саўладаць з Піліпкам, ён выкрыквае брудную лаянку.

З 28 лістапада па 2 снежня ў Кіеве адбудзецца Усесаюзная нарада па пытаннях сучаснай народна-паэтычнай творчасці, якая склікаецца Каардынацыйнай камісіяй па народнай творчасці пры Аддзяленні літаратуры і мовы Акадэміі навук СССР, Інстытутам сусветнай літаратуры імя М. Горкага АН СССР, Інстытутам рускай літаратуры АН СССР (Пушкінскі Дом) і Інстытутам мастацтвазнаўства, фальклору і этнаграфіі АН УССР. У нарадзе прымуць удзел і беларускія фалькларысты. Яны выступяць з навуковымі паведамленнямі і інфармацыямі, прымуць удзел у абмеркаванні дакладаў.

Публікуем артыкул удзельніка нарады—доктара філалагічных навук П. Ахрыменкі. У артыкуле пастаўлены некаторыя спрэчныя пытанні сучаснай фалькларыстыкі, якія будуць абмяркоўвацца на нарадзе.

СКАРБЫ НАРОДНЫЯ

П. АХРЫМЕНКА.

Фальклор і літаратура — два віды слоўнага мастацтва. Калі літаратура даўно ўжо чотка вызначана як прадмет, то фальклор да гэтага часу не мае такога вызначэння. У сувязі з гэтым туманнымі здаюцца і задачы фалькларыстыкі. Не выпадкова ў нашым друку ў апошні час з'явіліся такія праблемныя работы, як артыкул Л. Емяльянава «Чым павінна быць фалькларыстыка?» («Русская литература», 1960, № 2). Больш таго з-за адсутнасці чоткага вызначэння прадмета фальклору ў нашай фалькларыстыцы акрэсліліся супрацьлеглыя тэндэнцыі, два пункты погляду на сучасны савецкі фальклор. Адзін з іх умоўна можна назваць «скептычным», а другі—«ультрааптымістычным».

Прадстаўнікі «скептычнага» пункту погляду (Н. Ляонцьеў, В. Бахцін, асабліва Л. Емяльянаў) адмаўляюць відавочны факт развіцця народна-паэтычнай творчасці ў нашы дні, лічаць яе адміраючай і нават зусім неіснуючай. Прадстаўнікі «ультрааптымістычнага» напрамку (напрыклад, В. Сідзельнікаў) сцвярджаюць, што ў нашы дні назіраецца «бурнае развіццё» амаль усіх відаў і жанраў фальклору, у тым ліку эпічных. І тыя, і другія погляды вылучаюцца крайняй аднабаковасцю, а значыць—не могуць быць аб'ектыўна-навуковымі, у аднолькавай ступені наносяць шкоду фалькларыстыцы, а галоўнае — тармозяць развіццё сучаснай народнай творчасці. Адны, па сутнасці справы адмаўляючы існаванне сучаснага савецкага фальклору, у якойсьці ступені зніжаюць творчую энергію мас, а другія, аб'яўляючы народнай творчасцю фальклорападобныя падробкі і імітацыі, прыніжаюць сучасную народную творчасць.

Фальклор і літаратура адлюстроўваюць рэчаіснасць праз слоўна-мастацкія вобразы. Перш за ўсё гэта вызначае іх сутнасць, у гэтым яны маюць агульныя рысы. У той жа час фальклор і літаратура розныя па характару бытавання: фальклорныя творы звычайна бытуюць вусна, а літаратурныя ў пісьмовай форме. Значыць, вуснае бытаванне неабходна прызнаць асноўнай прыкметай фальклору як віду слоўнага мастацтва. Іменна такое вызначэнне фальклору намецілася яшчэ Ю. Сакаловым («Рускі фальклор»), а затым А. Нячаевым і Н. Рыбаковай (гл. «Новый мир», 1954, № 8) і некаторымі іншымі фалькларыстамі, але не атрымала патрэбнага развіцця і завяршэння.

З самага пачатку саракавых гадоў (пачынаючы з рэцэнзіі Н. Андрэева на «Рускі фальклор» Ю. Сакалова) і да гэтага часу ўсё больш настойліва гучыць патрабаванне ўдакладніць паняцце «фальклор», ліквідаваць недакладнасць і блытаніну ў яго вызначэнні. Больш таго, гавораць аб неабходнасці новага вызначэння фальклору, маўляў, ранейшае нібы ўстарэла ў сувязі са змяненнем характару фальклору ў нашы дні. У той жа час ніхто з літаратуразнаўцаў не ставіць пытання аб змене паняцця «літаратура», хоць сутнасць яго далёка не тая, што была ў дакастрычніцкі перыяд. Значыць, у нас наогул не было чоткага вызначэння прадмета фальклору. Іменна з яго патрэбна і пачынаць, каб разабрацца ў надзённых праблемах сучаснай фалькларыстыкі.

Як вядома, да з'яўлення літаратуры патрэбнасць народа ў слоўна-мастацкім развіцці задавальняў фальклор. Пазней, калі з'явілася літаратура, некаторыя лепшыя яе творы таксама сталі набываць вуснае бытаванне—сталі пранікаць у фальклор (які ў сваю чаргу быў і ёсць адной з важнейшых крыніц літаратуры). Характэрна, што ў фальклор пранікала і пранікае далёка не ўсё лепшае з літаратуры, а толькі тое, што адпавядае законам вуснага бытавання. Сам народ не адрозніваў, ды і ў нашы дні амаль не адрозніваў фальклору па паходжанню (які ўзнік сярод мас) ад фальклору па бытаванню (які мае літаратурнае паходжанне). Аднак многія фалькларысты надавалі і надаюць гэтаму перабольшанае значэнне, што і прывяло да блытаніны ў фалькларыстыцы.

Да цяперашняга часу асаблівая ўвага ўдзяляецца «вуснасці» паходжання фаль

Ад Варонежа, ад Дона...

Хто не ведае ў нашай краіне выдатнай варонежскай спявачкі, стваральніцы і выканаўцы дасціпных вясёлых частушак, народнай артысткі РСФСР Марыі Мардасавай? Калі не па выступленнях з эстрады, дык з радыёперадач і па грампласцінках кожны напэўна знаёмы з яе самабытнай творчасцю.

Вестка пра тое, што ў Мінск прыязджае на гастролі Дзяржаўны Варонежскі рускі народны хор разам са сваёй вядучай салісткай. М. Мардасавай, узрадавала шматлікіх аматараў мастацтва. Першыя канцэрты гэтага творчага калектыву перад мінчанамі паказалі яго сапраўдную мастацкую культуру і своеасаблівую манеру выканання, якая вызначаецца душэўнай высакароднасцю, прастатой, непадкупнай шчырасцю і сціпласцю перадачы пачуццяў і настрояў. Празрыстая свежасць і чысціня гучання жаночых галасоў, іх стройная знітаванасць з мужчынскімі галасамі ствараюць для Варонежскага хору вялікія выканаўчыя магчымасці.

Варонежцы здаўна славяцца пасеннымі традыцыямі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, не трацячы сваёй прыгажосці і сілы эмацыянальнага ўздзеяння на слухачоў. А якія цудоўныя песні жывуць у народзе па-над ціхім Донам! Прыемна чуць у майстэрскім выкананні варонежскіх спевакоў старадаўнія рускія народныя песні: «Как по погребу боченочек катается» (апрацоўка галоўнага хармайстра Ул. Яфімава), «Блыха» (напеў М. Мардасавай), «Ой, мароз, мароз» (напеў М. Марозавай) і інш.

Самае ж галоўнае ў творчасці Варонежскага хору — гэта тое, што, усяляк захоўваючы і развіваючы традыцыі народнага шматгалосага спявання, беражліва ставячыся да фальклорных запісаў, ён разам з тым стварае актуальны сучасны рэпертуар, заўсёды ідзе ў нагу з жыццём. Тут перш за ўсё нямала сіл прыклаў К. Масаліцінаў, не толькі як нязменны мастацкі кіраўнік варонежцаў, але і як кампазітар—аўтар меладычных масавых песень, створаных ім для хору.

Мінчанам асабліва прыйшліся па душы такія харавыя творы К. Масаліцінава, як «Ад Варонежа, ад Дона», «Паглядзі ты, сокал», «За гаем, за дубраваю», а таксама твор для спявання сола «Песня дарогу знойдзе», задушэўна выкананы салісткай хору народнай артысткай РСФСР Ю. Залатаровай. Яна ж натхнёна праспявала песню «На варонежскіх прасторах» мясцовага аўтара Ю. Варанцова.

У стварэнні сучаснага рэпертуару для Варонежскага хору ўдзельнічае і баяніст Ул. Рудэнка. Многія з яго твораў, што прагучалі ў канцэртах, у прыватнасці патрыятычны хор «Гэта наша мара», працяжныя лірычныя песні «У зялёным ціхім гаёчку» (у выкананні жаночай групы хору) і «Ой, у лясочку» (салістка Л. Аўдзеева), гавораць пра несумненную таленавітасць іх аўтара.

Варонежскія спевакі па праву ганарацца сваімі таленавітымі частушачніцамі М. Мардасавай і М. Марозавай, якія самі ствараюць мелодыі новых частушак, прыпевак, а таксама надзённыя тэксты да іх, кожны раз захапляючы гледачоў сваёй дасціпнасцю, багатай народнай выдумкай і гумарам. Асабліва вялікі, невычэрпны рэпертуар у М. Мардасавай. Тут і гераічныя прыпеўкі пра рускіх волатаў-касманаўтаў, і калгасныя гумарыстычныя куплеты «Вось якая парачка», і мноства лірычных, поўных задушэўнага цяпла, дзявочых «страданняў». Спявае іх М. Мардасава лёгка, свабодна, грацыёзна.

Шмат цікавых і запамінальных нумароў паказала танцавальная група Варонежскага хору (пастаноўшчык танцаў А. Шостак). Амаль усе харэаграфічныя творы абавязкова суправаджаюцца спяваннем харыстаў.

Г. ЗАГАРОДНІ.

На здымках вы бачыце выступленне Варонежскага хору і яго салісткі М. Мардасавай.

ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ

Споўнілася шэсцьдзесят год з дня нараджэння аднаго з буйнейшых савецкіх тэатразнаўцаў, доктара мастацтвазнаўства Георга Гаяна. Яго работы шырока вядомыя.

Г. Гаян нямала зрабіў для развіцця рускага тэатразнаўства. Яго кніжка «Глікерыя Фядотава», напісаная яшчэ ў 30-х гадах, не толькі не страціла свайго значэння, але і сёння з'яўляецца самай цікавай і капітальнай работай аб выдатнай рускай актрысе.

Георг Гаян—буйнейшы даследчык армянскага тэатра. Яму першаму ўдалося не толькі абгрунтаваць і даказаць, але і распрацаваць бесперапынную двухтысячагадовую гісторыю армянскага тэатра. З задуманага аўтарам пяцітомнага выдання пакуль што выйшлі ў свет толькі першыя дзве кнігі. Яны ў поўным сэнсе слова здзіўляюць сваёй глыбінёй, вялікай эрудыцыяй і навуковай праніклівасцю даследчыка. Аўтар умее за асобнымі фактамі і падзеямі разглядзець увесь працэс.

Г. Гаян не абмяжоўваецца вывучэннем паасобных тэатральных з'яў мінулага. Дзейнасць вучонага і крытыка вельмі шырокая і рознабаковая. Асабліва вялікія яго заслугі ў галіне вывучэння гісторыі тэатра народаў СССР. Раней былі ў нас тыя ці іншыя крытычныя работы пра асобныя тэатры з нацыянальных рэспублік. І толькі. Прафесар Г. Гаян упершыню заклаў асновы вывучэння іх агульнага працэсу. Яго па праву можна лічыць заснавальнікам новай у нас навукі—гісторыі тэатра народаў СССР.

З'яўляючыся ў Маскоўскім інстытуце тэатральнага мастацтва імя Луначарскага загадчыкам кафедры тэатра народаў СССР з моманту яе заснавання, Г. Гаян не толькі сам вывучае тэатральнае жыццё нацыянальных рэспублік, але і фактычна кіруе работай даволі шматлікага атрада мастацтвазнаўцаў. Ён дае парады і непасрэдныя ўказанні нашым даследчыкам, а таксама выступае ў друку па найбольш агульных пытаннях метадалогіі і методыкі.

Асабліва вялікую работу Гаян праводзіў і праводзіць зараз па стварэнню сапраўднай навуковай гісторыі тэатра кожнага з народаў, у тым ліку і гісторыі беларускага тэатра. Даволі напружаную барацьбу давялося яму весці з тымі даследчыкамі, якія лічылі, быццам беларускі тэатр пачаўся толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Не так даўно ў нас выйшла кніжка Уладзіміра Няфёда «Беларускі тэатр. Нарысы гісторыі» пад рэдакцыяй Георга Гаяна, у якой грунтоўна асвятляецца тэатральнае жыццё нашай рэспублікі, цікавае і шматвяковае. Цяпер, бадай, усе ўжо лічаць, што заснавальнікам беларускага прафесіянальнага тэатра з'яўляецца Ігнат Буйніцкі. А іменна гэтага ў свой час упарта і паслядоўна дамагаўся Г. Гаян. У выдавецтве «Искусство» пад яго рэдакцыяй выпускаецца цэлая серыя нарысаў па гісторыі нацыянальных тэатраў. Павінна ў бліжэйшы час выйсці кніжка і аб беларускім тэатры.

Вывучэнне мастацтва нашага многанацыянальнага народа — справа вельмі вялікая і складаная. Яна не пад сілу аднаму чалавеку, і гэта, вядома, добра разумее Георг Гаян. Ці не таму ён цяпер звязан з даволі вялікім атрадам мастацтвазнаўцаў з саюзных рэспублік? Калі трэба—аказвае ім усялякую падтрымку і дапамогу, а то і сам нярэдка кансультуецца з імі, просіць парад.

У прафесара Г. Гаяна цяпер многа вучняў. Гэта і студэнты-тэатразнаўцы, і аспіранты з розных саюзных рэспублік. Гэта і больш вопытныя і сталыя супрацоўнікі, якія будуць займацца пад яго кіраўніцтвам у дактарантуры. У тым ліку—і прадстаўнікі Беларусі. Уладзімір Няфёд, Уладзімір Стэльмах ды і іншыя маладыя і сталыя навуковыя работнікі і крытыкі—усе яны абавязаны Георгу Гаяну за яго разумную, добрую дапамогу.

Гады наклалі свой адбітак на гэтага чалавека. Але энергія, працаздольнасць усё тыя ж, што і ў маладосці, калі не мацнейшыя нават. Да ўсяго яму справа, да ўсяго дачыненне, ці гэта будзе датычыць гістарычных фактаў і падзей, ці сённяшняга жыцця нашых тэатраў.

— Вы вось едзеце ў Мінск,—кажа Георг Іосіфавіч аднаму з беларускіх тэатразнаўцаў.—Там неўзабаве павінны адзначаць стагадовы юбілей з дня нараджэння Ігната Буйніцкага. Унясіце прапанову, каб Беларускаму тэатральна-мастацкаму інстытуту прысвоілі імя першага арганізатара вашага прафесіянальнага тэатра Буйніцкага. Гэтак жа, як носіць інстытут імя Карпенкі-Карага на Украіне, Астроўскага ў Ленінградзе... Толькі вы пабольш гаварыце і пішыце пра гэта, можа і ўдасца дамагчыся... — настойвае на сваім прафесар.

Чаму б, думаецца нам, і сапраўды не надаць нашаму тэатральна-мастацкаму інстытуту імя Буйніцкага.

...Што можна пажадаць чалавеку, які пражыў шэсцьдзесят год і з іх сорак аддаў рабоце на нашае многанацыянальнае мастацтва. Ну, вядома ж, яшчэ доўгіх і плённых год жыцця на работу, якой так яшчэ многа ў Георга Гаяна, на развіццё мастацтвазнаўчай навукі, на падрыхтоўку новай таленавітай змены.

Бабруйскія мінеральныя воды

Два віды каштоўных лячэбных мінеральных вод выявілі ў паўночна-заходнім раёне Бабруйска гідрагеолагі Цэнтральнай гідрагеалагічнай экспедыцыі Навукова-даследчага інстытута курортаталогіі і фізіятэрапіі СССР.

У гутарцы старшы гідрагеолаг разведвальнай партыі П. Дзмітрыева паведаміла:

— Бабруйская лячэбна-пітная вада па свайму хімічнаму саставу аналагічная вядомай у краіне Іжэўскай крыніцы і знойдзе шырокае выкарыстанне пры лячэнні страўнікава-кішэчных захворванняў.

На глыбіні 320 метраў выяўлены велізарныя запасы хларыдна-натрыевай вады высокай мінералізацыі.

У Мінску адбыліся гастролі чэхаславацкага віяланчаліста С. Вечтомава. Разам з дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР ён выканаў Канцэрт для віяланчэлі з аркестрам Дворжака. У сольным выступленні віяланчаліст выканаў санату Экельса, сюіту нумар Пяць Баха, «Усходні танец» Рахманінава, творы Марціну, Бруха і іншых кампазітараў.

На здымку: віяланчаліст С. Вечтомаў.

„НЕМАН" № 6

На першых старонках шостага нумара часопіса (лістапад—снежань) надрукаваны верш П. Броўкі (у перакладзе Н. Кісліка) і артыкул Р. Сабаленкі, прысвечаныя новай Праграме КПСС.

Пад рубрыкай «Справы і людзі сямігодкі» змешчаны нарысы П. Кавалёва «Святло сэрца» (пераклад М. Дастанкі) і М. Жыгоцкага «Сіні агеньчык».

Проза прадстаўлена апавяданнямі «Ля сцен Брэста» С. Бабронка, «Цётка Тоня і яе пляменнікі», «Алёніна сцежка» В. Высоцкага, «Смычок і Васька» А. Фомчанкі, «Такое яе сэрца» М. Ракітнага (пераклад аўтара), «Васіліса» А. Васілевіч (пераклад К. Цітова), а таксама «Апавяданнямі аб добрым сумленні» С. Курылёвай і «Маленькімі апавяданнямі» М. Касарэнкі. Часопіс друкуе дакументальную аповесць В. Рудава «Цьмянае золата».

Змешчаны новыя вершы Ю. Лакербая і В. Костылева.

Раздзел «Мастацтва» складаюць артыкулы Ул. Бойкі «Калі ажывае камень» і А. Міхайлава «Адзінаццатая муза».

Надрукаваны артыкул Д. Маслава і А. Шчарбакова «Ёсць на Палессі магіла...» і Б. Гур'ева «Аб чым расказваюць афішы».

Літаратурная крытыка прадстаўлена артыкулам Н. Лапідуса «Максім Багдановіч — літаратурны крытык» і рэцэнзіямі на кнігі «Дзве аповесці» П. Галавача, «Рэха» А. Пысіна, «На хвалях жыцця» В. Панамарова і «Пра тых, хто выстаяў» М. Яругіна.

У раздзеле «Сатыра і гумар»— апавяданне Л. Прокшы і вершы І. Славіна.

Часопіс ілюстраваны.

СКАРБЫ НАРОДНЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Такім чынам, фальклор — гэта слоўна-мастацкія творы, якія бытуюць ці бытавалі вусна.

Вуснае бытаванне слоўна-мастацкіх твораў патрабуе ад іх асаблівых якасцей, пры гэтым не толькі высокага ідэйна-мастацкага ўзроўню. Самыя што ні ёсць народныя і мастацкія, скажам, раманы і аповесці не могуць па сваёй прыродзе перайсці ў вуснае бытаванне. Больш таго, нават найбольш удалыя «савецкія быліны», «савецкія думы» і іншыя падобныя творы, нягледзячы на настойлівую і працяглую іх папулярызацыю, так і засталіся літаратурнымі фактамі, у тым ліку «літаратурай, створанай вусна», а ў вуснае бытаванне не перайшлі — не былі падхоплены народам і не сталі фальклорам, не сталі народна-паэтычнай творчасцю. Гэта сведчыць, што народнасць зместу і формы слоўна-мастацкіх твораў далёка не заўсёды адпавядае паняццю народна-паэтычнай творчасці. Народны твор далёка не заўсёды можа быць народна-паэтычным, а таму недапушчальная і блытаніна гэтых паняццяў, якая шырока распаўсюджана ў нашых фалькларыстыцы і літаратуразнаўстве.

Гэта блытаніна з усёй відавочнасцю адчуваецца, напрыклад, у пытанні, якое паставіў Н. Ляонцьеў у сваім нашумеўшым артыкуле «Валхаванне і шаманства» («Новый мир», 1953, № 8): «Няўжо толькі вусная творчасць можа называцца народнай?... Па якіх прыкметах можна адрозніць звычайную савецкую песню ад народнай песні?»

На гэтае пытанне адказаць няцяжка, калі добра высветліць, што такое фальклор. Народнымі і ненароднымі могуць быць і літаратурныя і фальклорныя творы. Праўда, у дакастрычніцкі перыяд у фальклоры народных па духу твораў было больш, чым у літаратуры. У савецкі ж час зніклі класавыя адрозненні паміж літаратурай і фальклорам: і ў тым, і ў другім відзе слоўнага мастацтва большасць твораў — народныя. У прыватнасці, народныя па свайму характару многія і многія і літаратурныя і народна-паэтычныя песні. Усё ж большасць песень літаратурнага паходжання, нягледзячы на народнасць іх зместу і нават на падкрэсліванне ў іх загалоўках і падзагалоўках, а нярэдка і ў самім тэксце, што гэта іменна «песні», застаецца літаратурай — не падхоплена масамі, не набыла вуснага бытавання, хоць у шэрагу выпадкаў такія песні з'яўляюцца «чытабельнай літаратурай». У той жа час некаторыя літаратурныя песні актыўна пранікаюць у вуснае бытаванне, спяваюцца народам, папаўняюць народна-песенны рэпертуар. Вось такія песні (якія адносяцца да фальклору па бытаванню) разам з песнямі, якія ўзніклі ў масах (разам з фальклорам па паходжанню) і адносяцца да народна-паэтычнай творчасці, не перастаючы быць — у аўтарскай рэдакцыі — і фактамі літаратуры.

Такі ж адказ трэба даць і на другую частку пытання Н. Ляонцьева, які звяртаецца да Сідзельнікава: «І куды загадае аднесці доктар В. Сідзельнікаў усе сучасныя мастацкія творы, якія створаны не вусна, а на паперы пры дапамозе пяра?»

Зусім ясна, што гэтыя творы, будучы мастацкімі, адносяцца да прафесіянальнай ці самадзейнай літаратуры, і толькі тыя з іх, якія перайшлі ў вуснае бытаванне, з'яўляюцца адначасова і фальклорам. У вусным бытаванні яны звычайна ў той ці іншай ступені змяняюцца, вар'іруюцца, нават «рэдагуюцца», нярэдка паляпшаюцца, шліфуюцца, хоць калі-нікалі назіраецца і пагоршанне аўтарскіх тэкстаў. Усё гэта абумоўлена вусным бытаваннем слоўна-мастацкіх твораў і характэрна як для мінулых часоў, так і для нашых дзён, як для фальклору па паходжанню, так і для фальклору па бытаванню.

Вуснае бытаванне мастацкага слова вынікае з самой прыроды чалавека, з неабходнасці шырокіх і рознабаковых зносін між людзьмі, з патрэбнасці выказвання іх пачуццяў у мастацкай форме. Ніколі ні ў якой галіне дзейнасці не знікне творчая ініцыятыва мас. Нават самыя геніяльныя адзінкі не заменяць народа, не прывядуць яго ў стан інертнасці, у стан простага спажыўца гатовай «прадукцыі». Гэта датычыць і слоўна-мастацкай культуры.

Адмаўленне некаторымі фалькларыстамі-«скептыкамі» сучаснай савецкай народна-паэтычнай творчасці супярэчыць відавочным фактам. Настолькі беспадстаўна і «ультраапытмістычнае» сцвярджэнне аб развіцці ў нашы дні такіх жанраў традыцыйнага фальклору, як быліны, думы і інш.

Ужо ў першыя гады Савецкай улады, ва ўмовах небывалай актыўнасці творчай ініцыятывы мас, вызначыліся характэрныя рысы і жанравыя асаблівасці нашай народна-паэтычнай творчасці. Пачынаючы з Кастрычніка і грамадзянскай вайны, у новых умовах далейшае развіццё атрымалі, калі мець на ўвазе ўсходнеславянскія народы, песні, частушкі і каламыйкі, прыказкі і пагаворкі, сказы-паданні, анекдоты, загадкі. Іменна гэтыя жанры фальклору развіваюцца і бытуюць і ў нашы дні. Пра гэта сведчаць шматлікія матэрыялы фальклорных экспедыцый.

У сярэдзіне трыццатых гадоў намеціўся новы ўздым у развіцці савецкай народна-паэтычнай творчасці. Гэта тлумачыцца грандыёзнымі поспехамі мірнага сацыялістычнага будаўніцтва і культурнай рэвалюцыі ў нашай краіне. У гэты ж час узнікла і вядомая фетышызацыя фальклору ў цэлым, асабліва вусна-паэтычнай творчасці савецкай эпохі. У той фетышызацыі немалую ролю адыграў культ асобы Сталіна. Усё, створанае аб ім, у тым ліку ў працэсе мастацкай самадзейнасці, хвалілася і заахвочвалася. Многія «народныя» майстры нярэдка ставілі перад сабой карыслівыя мэты. Яны ўсяляк хвалілі Сталіна ў разнастайных «фальклорных», па сутнасці фальклорападобных, творах, у тым ліку ў «савецкіх былінах», «савецкіх казках», «савецкіх думах» і г. д. Гэта ў сваю чаргу выклікала новыя падробкі пад фальклор, фальклорныя імітацыі, якія разам з іншымі нізкапробнымі творамі літаратурнай самадзейнасці (пісьмовай і вуснай) засмечвалі многія фальклорныя зборнікі, народна-паэтычную творчасць савецкіх людзей.

Фетышызацыя народна-паэтычнай творчасці выклікала, урэшце, бурную рэакцыю з боку некаторых фалькларыстаў, якія ў час палемікі, выказаўшы шэраг каштоўных думак і назіранняў, дагаварыліся да адмаўлення сучаснай савецкай народна-паэтычнай творчасці, таму што з-за «фальклорнай» макулатуры ў нашай фалькларыстыцы зніклі выразныя абрысы самога прадмета вуснай паэзіі.

На самай жа справе савецкая народна-паэтычная творчасць развіваецца і ў нашы дні. Яна ствараецца ў народных масах, у асаблівасці ў працэсе мастацкай самадзейнасці, а таксама і прафесіянальнымі пісьменнікамі, якія з'яўляюцца часткай савецкага народа. Стварэнне гэта ідзе, як ужо гаварылася, і «вусна», і «пісьмова», пры гэтым удзельная вага «пісьмовага» пачатку ў нашым фальклоры, дзякуючы ўсеагульнай пісьменнасці і высокай культуры савецкіх людзей, усё больш узрастае, што з'яўляецца адной з асаблівых рысаў савецкай народна-паэтычнай творчасці.

Непасрэдна ў народных масах узнікаюць многія песні, частушкі, каламыйкі, прымаўкі і пагаворкі, загадкі, сказы-паданні, а таксама анекдоты.

Дарэчы, аб анекдотах, якія з'яўляюцца адным з відаў рэалістычных казак, нашы фалькларысты вельмі мала гавораць. Напрыклад, нядаўна выйшаў зборнік «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны». У ім матэрыял размешчаны па жанрах, пры гэтым адпаведна названы амаль усе раздзелы: песні, частушкі, прыказкі, пагаворкі і г. д., а анекдоты аб'яднаны пад рубрыкай «Сатыра і гумар»...

У развіцці савецкай народна-паэтычнай творчасці, асабліва фальклору нашага часу, вельмі вялікую ролю адыгрывае як прафесіянальная літаратура, так і самадзейная літаратура — творчасць непрафесіянальных аўтараў, сярод якіх нямала ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Роля мастацкай самадзейнасці і ў прыватнасці самадзейнай літаратуры ў развіцці савецкай народна-паэтычнай творчасці настолькі вялікая, што некаторыя фалькларысты, напрыклад С. Васілёнак, ставяць паміж імі знак роўнасці (гл. «Советскую этнографию», 1953, № 2). Аднак атаесамліваць літаратурную самадзейнасць з фальклорам ніяк нельга, бо далёка не ўсё, што створана ёю, падхопліваецца масамі і, значыць, набывае вуснае бытаванне.

М. Горкі, які высока цаніў самадзейную літаратуру, падкрэсліваў, што «яна... пакуль што развіваецца намнога больш ушырыню, чым углыбіню». Гэта абавязвае нас не толькі захапляцца самадзейнай літаратурай, як і мастацкай самадзейнасцю ў цэлым, але і перш за ўсё кіраваць яе развіццём, дабівацца павышэння яе ідэйна-мастацкага ўзроўню. Гэта дабратворна адаб'ецца і на народна-паэтычнай творчасці, якая ў многім жывіцца за кошт самадзейнай літаратуры.

Аб значэнні і ролі мастацкай самадзейнасці ў цэлым, у тым ліку народна-паэтычнай творчасці, выразна сказаў М. С. Хрушчоў у сваім дакладзе «Аб Праграме Камуністычнай партыі Савецкага Саюза» на XXII з'ездзе КПСС: «Шырокую арэну выяўлення і развіцця народных талентаў і дараванняў уяўляе сабой мастацкая самадзейнасць, якая набывае ўсё большы размах. Гэта, аднак, не здымае неабходнасці развіцця прафесіянальнага мастацтва. У творчай дзейнасці прафесіянальных калектываў і вядомых майстроў мастацтва мастацкая самадзейнасць будзе і надалей знаходзіць для сябе ўзоры, на якія патрэбна раўняцца. У сваю чаргу народная творчасць будзе служыць невычэрпнай крыніцай абагачэння і росквіту прафесіянальнай літаратуры і мастацтва».

Гэта яшчэ раз пацвярджае думку аб тым, што наша народна-паэтычная творчасць з'яўляецца паралеллю прафесіянальнай літаратуры. Гэтыя «паралелі» цесна пераплятаюцца між сабою, усё больш збліжаюцца, але не зліваюцца. Народна-паэтычная творчасць, як і літаратура, будзе развівацца і надалей. У сваім развіцці яна павінна арыентавацца на лепшыя дасягненні прафесіянальнай літаратуры і ў той жа час служыць ёй важнейшай і невычэрпнай крыніцай.

Перад нашай фалькларыстыкай стаіць нямала складаных задач. Неабходна канчаткова вызначыць прадмет фальклору, глыбока вывучыць прычыны і законы вуснага бытавання многіх слоўна-мастацкіх твораў мінулага і сённяшняга, выясніць прычыны з'яўлення тых ці іншых фальклорных жанраў, вызначыць асноўныя віды і этапы развіцця творчага метаду фальклору, яго своеасаблівасць у адлюстраванні і тыпізацыі рэчаіснасці, вывучыць характар і значэнне сувязей фальклору і літаратуры, да канца высветліць сутнасць і спецыфіку народна-паэтычнай творчасці ў нашы дні, яе нацыянальныя асаблівасці і перспектывы далейшага развіцця і г. д. Толькі пры ўмовах паспяховага вырашэння ўсіх актуальных праблем наша фалькларыстыка выканае свой абавязак перад народам, заваюе сабе ўстойлівае і ганаровае месца ў цыкле сучасных гуманітарных навук.

„ВЫ СУСТРЭНЕЦЕ СВІТАННЕ"

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ СТЭФАНА ЦВЕЙГА

У АДНЫМ з самых маляўнічых месц Аўстрыі, каля схілаў блакітных Альпаў — у Зальцбургу, восемдзесят год назад нарадзіўся Стэфан Цвейг, аб якім Горкі пісаў, што ён спалучыў у сабе «талент глыбокага мыслісля з талентам першакласнага мастака».

Пачаўшы творчы шлях як аўтар зборніка «Сярэбраныя струны», які напісаны яшчэ пад моцным уплывам мадэрнізму, Стэфан Цвейг у далейшым праявіў бліскучы талент у жанры навелы і ў жанры раманізаваных біяграфій.

Прадаўжаючы лепшыя традыцыі заходнееўрапейскай навелістыкі, адчуваючы жыватворчы ўплыў рускай класічнай літаратуры, у прыватнасці Тургенева, Льва Талстога і Дастаеўскага, Стэфан Цвейг стаў агульнапрызнаным майстрам псіхалагічнай навелы.

Для лепшых твораў С. Цвейга характэрны любоў і давер'е да чалавека, бесперапынныя пошукі праўды і справядлівасці, нянавісць да ўсялякага роду прыгнёту, да войнаў.

У разгар першай сусветнай вайны С. Цвейг піша трагедыю «Іерэмія», у якой на аснове біблейскага сюжэта паказвае жорсткасць і бессэнсоўнасць вайны. У цэнтры гэтай п'есы — вобраз гуманіста Іерэміі, які выступае супраць цара Зэдэкіі — увасаблення дэспатызму і тыраніі. Аднак Іерэмія змагаецца ў адзіночку. У яго няма падтрымкі ў народзе.

Моцныя і слабыя бакі творчасці С. Цвейга, якія выявіліся ў гэтай трагедыі, тыповыя і для наступных яго твораў. Для многіх навел і раманізаваных біяграфій Цвейга характэрны «адзінкавы» канфлікт героя, узятага па-за сацыяльнымі сувязямі, з варожым для яго светам.

Адна з галоўных тэм навел Цвейга — тэма трагічнага кахання. «Мне здаецца, — заўважыў М. Горкі,—што да яго ніхто не пісаў аб каханні так пранікнёна і з такой выключнай міласэрнасцю да чалавека. І паўтараю, з такой глыбокай увагай да жанчыны, у чым яна даўно мае патрэбу і што ўсямерна заслужыла...»

Тут, у святле псіхалагічных назіранняў, у сферы найтанчэйшых любоўных перажыванняў, у галіне сардэчных узрушэнняў, Цвейг быў непераўзыйдзеным майстрам. Успомнім хоць бы такія ўсюды вядомыя навелы аўстрыйскага пісьменніка, як «Амок», «Пісьмо незнаёмкі», «Дваццаць чатыры гадзіны з жыцця жанчыны».

Звычайна ў манатонным і абыдзённым жыцці цвейгаўскіх герояў адбываюцца нечаканыя павароты, наступае той «ракавы момант», які парушае іх спакойнае жыццё і ставіць тварам да твару са складанымі псіхалагічнымі канфліктамі. І тады яго герой ці гераіня пачынаюць задумвацца над сэнсам жыцця і прыходзяць да вываду, што ў свеце яшчэ многа зла і эгаізму і што чалавек не можа быць адзінокі, што ён павінен клапаціцца аб другіх людзях і памагаць ім.

Навела Цвейга — гэта, перш за ўсё, псіхалагічная навела. Падобна камертону, яна настройвае сэрцы чытачоў у неабходным аўтару сугуччы, яна выклікае ў чытачоў хваляванне, спачуванне і любоў. У пісьме да Цвейга Максім Горкі так перадаваў сваё ўражанне ад апавядання «Пісьмо незнаёмкі»: «Чытаючы гэтае апавяданне, я смяяўся ад радасці — так добра Вы зрабілі гэта! І бессаромна плакаў ад спачування да Вашай гераіні, ад нясцерпнага хвалявання, якое выклікае яе вобраз і сумная песня яе сэрца». Па словах Горкага, у літаратуры было многа апісанняў «нешчаслівага кахання», але цяжка прыпомніць апавяданне, якое насычана чысцейшым і цнатлівым лірызмам, як «Пісьмо незнаёмкі» Цвейга: «Сентыментальнасць яму незнаёма, ён, відавочна, арганічна не схільны да яе. ён праўдзівы і мудра просты, як сапраўдны мастак».

Не будучы рэвалюцыянерам Цвейг знаходзіўся на пазіцыях абстрактнага гуманізму. Ён не здолеў даць у сваіх творах вернага і поўнага адлюстравання жыцця народных мас. Але апісваючы быт і норавы, галоўным чынам, прывілеяваных слаёў насельніцтва буржуазнага грамадства, Цвейг тым не менш не заплюшчваў вочы на сацыяльныя супярэчнасці капіталістычнага ладу. Ён з уласцівым яму майстэрствам паказаў, як падман, двудушнасць і эгаізм разлучаюць людзей у свеце нажывы, калечаць іх душы і прыводзяць да маральнай пагібелі.

Майстэрства Цвейга-навеліста выяўляецца, перш за ўсё, у яго мове—лаканічнай, гнуткай і эмацыянальнай, у напружаным драматызме яго сюжэта, у дакладнасці характарыстык і дэталей. Для вызначэння творчай манеры Цвейга прыгодны вядомы афарызм Чэхава аб тым, што «сціслась — сястра таленту» і што мастацтва пісьменніка заключаецца ва ўменні закрэсліваць непатрэбнае.

Да псіхалагічных навел Цвейга тэматычна прымыкае яго адзіны раман «Нецярпенне сэрца», выдадзены ў 1939 г. Іменна ў гэтым, адным з апошніх твораў пісьменніка, адлюстраваўся крызіс яго гуманізму і супярэчлівасць яго светапогляду, звязанага з верай Цвейга ў сілу асобнага чалавека, адарванага ад народных мас. Другая сусветная вайна поўнасцю знішчыла ліберальныя ілюзіі пісьменніка і паслужыла адной з прычын яго самагубства.

Значную цікавасць мае славуты цыкл раманізаваных біяграфій, напісаных Цвейгам з уласцівым яму бляскам і пераканаўчасцю. Перад намі як жывыя паўстаюць героі гэтых нарысаў і раманаў: Бальзак і Горкі, Эразм Ротэрдамскі і Марыя Антуанета, Дастаеўскі і Ралан, Фушэ і Марыя Сцюарт, Дзікенс і Марселіна Дэборд-Вальмор, Ружэ дэ Ліль і Магелан, Казанова і Ніцшэ, Клейст і Гельдэрлін, — людзі розных эпох і прафесій, розных тэмпераментаў і характараў. «Гісторыя жыцця славутых людзей — гэта гісторыя складаных душэўных канструкцый, — пісаў Цвейг савецкаму пісьменніку Ул. Лідзіну,— урэшце гісторыя Францыі XIX стагоддзя без разгадкі такіх асоб, як Фушэ ці Т'ер, была б няпоўнай. Мяне цікавяць шляхі, якімі ішлі тыя ці іншыя людзі, ствараючы геніяльныя каштоўнасці, накшталт Стэндаля ці Талстога, або здзіўляючы свет злачынствамі, накшталт Фушэ...»

Тонкім скальпелем бездакорнага майстэрства Цвейг здымае знешнія покрывы са сваіх рэальных персанажаў і глыбока пранікае ў іх унутраны свет, паказвае іх несакрушальную волю і слабасць, высакароднасць і нізасць, веліч і нікчэмнасць. Але і ў гэтым цыкле твораў пісьменнік прытрымліваецца суб'ектыўнага погляду на гісторыю. Ён жывапісуе сваіх герояў як адзінак, чыя моцная воля і творчае гарэнне з'яўляюцца прычынай гістарычнага прагрэсу.

Стэфан Цвейг быў шчырым сябрам Савецкага Саюза. У час святкавання юбілею Л. Талстога ў 1928 г. ён пабываў у нашай краіне. У дзень 20-й гадавіны Кастрычніка Цвейг пісаў: «...ніколі яшчэ Расія не перажывала больш значнага часу; у духоўным, у сацыяльным і ў палітычным сэнсе яе існаванне ніколі яшчэ так не хвалявала ўвесь свет».

З захапленнем гаварыў Цвейг пра рускую літаратуру, пра яе вялікіх пісьменнікаў. Высока цаніў ён Максіма Горкага. У дзень 60-годдзя вялікага пралетарскага пісьменніка Цвейг напісаў спецыяльную прамову, у якой вітаў Горкага і рускі народ.

Апошнія гады жыцця Цвейг правёў у Бразіліі. Другая сусветная вайна глыбока ўзрушыла пісьменніка-гуманіста. Далёка ад радзімы, не бачачы канкрэтных шляхоў для барацьбы з фашысцкім цемрашальствам, адчуваючы крах сваіх ліберальных ілюзій, пісьменнік пакончыў самагубствам.

У развітальным пісьме Цвейг пісаў: «Прывітанне ўсім маім сябрам. Хай яны сустрэнуць світанне! Я вельмі нецярплівы, і таму пакідаю вас...»

Цвейг не дажыў да гэтага світання, не дачакаўся вялікага дня перамогі над нямецкім фашызмам. Але ён верыў у перамогу гэтай зары, у перамогу лепшых чалавечых ідэалаў, якія так ярка і палымяна выказаны ў яго творчасці, прасякнутай гарачай і шчырай любоўю да людзей.

Н. ЛАПІДУС,
кандыдат філалагічных навук.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА, (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага мастацтва— 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 00471

Друкарня выдавецтва «Звязда»